№ 16 (326) 25 красавіка 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Масква здае Лукашэнку

Гандаль зброяй, «Сыстэмнае кіраваньне бізнэсам», «Інфабанк»: факсы і факты.

старонка 3

### Кадэбіст, які піша кнігі

Ігар Валахановіч выкрывае антысавецчыкаў.

старонка 7

### Маленькія прынцы «Рок-каранацыі»

Лёсы пераможцаў.

старонка 11

### Вера беларуса

Эсэ Людкі Сільновай.

старонка 12

# Майстры параднага партрэту



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**На выставе Ўладзімера Гардзеенкі «Мы нарадзіліся тут», якая экспануецца ў менскім Палацы мастацтваў (да 28 красавіка), можна пабачыць партрэты кіраўнікоў Гарадзенскае вобласьці Зьмітра Арцымені і Аляксандра Дубка. Сам У.Гардзеенка кажа, што іх выявы яму замовіў аблвыканкам. Ствараецца новае сэрвільнае мастацтва? Старонка 6.**

# Моцнага біскупа выслалі ў Сібір



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Папа Ян Павал II прызначыў новага каталіцкага ярарха ў Расею. Беларус Кірыла Клімовіч замяніць біскупа Ежы Мазура ў Іркуцку. Фактычна, ужо год дыяцэзія была «абезгалоўленая», бо ў красавіку 2002-га польскі грамадзянін Мазур, без тлумачэньня прычынаў, быў пазбаўлены расейскай візы й выдалены за межы Расеі. Цяпер ён прызначаны біскупам Элцкай япархіі ў Польшчы. Пасьля гэтага і іншых скандалаў з забаронай польскім сьвятарам уезду ў Расею, Ватыкан змушаны ставіць на расейскую дыяцэзію беларуса, які ня мае такіх праблемаў зь пераездам мяжы.

Біскуп Клімовіч быў дапаможным біскупам кардынала Сьвёнтака. Ён нарадзіўся ў 1952 г. у Казахстане. Дзіцем разам з бацькамі выехаў у Польшчу. Вышэйшую духоўную адукацыю атрымаў у Ольштыне (Польшча), тамсама служыў вікарыем каля дзесяці гадоў. У ліпені 1990 г. Клімовіч быў прызначаны ў Беларусь, настаяцелем і дэканам у Глыбокае. Дапаможным біскупам К.Клімовіч стаў у кастрычніку 1999-га. Ён абслугоўваў Менска-Магілёўскую архідыяцэзію. Клімовіч вольна гаворыць беларускай, польскай, расейскай ды італьянскай мовамі. Ён з тых маладых рыма-каталіцкіх сьвятароў-беларусаў, якія атрымалі добрую адукацыю й прыхільна ставяцца да беларушчыны. Камусьці ён бачыўся пераемнікам Казімера Сьвёнтака.

Прэсавая служба Ватыкану распаўсюдзіла паведамленьне, што прызначэньне «біскупа Кірылы Клімовіча дазволіць дыяцэзіі Сьв.Язэпа ў Іркуцку працягваць духоўнае і царкоўнае разьвіцьцё ў сьвятле Эвангельля Хрыстовага». Дыяцэзія Сьв.Язэпа ахоплівае ўсю усходнюю Сібір і складаецца зь пяці дэканатаў: Іркуцкага, Краснаярскага, Якуцкага, Уладзівастоцкага і Магаданскага. Яна аб’ядноўвае 43 зарэгістраваныя прыходы, дванаццаць дзейных касьцёлаў і дваццаць адну капліцу. Асаблівасьць дыяцэзіі — велізарная аддаленасьць асобных прыходаў (напрыклад, Тувы і Чукоткі). Таму праца для біскупа ва ўсходняй Сібіры даволі цяжкая, хоць і пэрспэктыўная ў пляне росту ў касьцельнай ярархіі. Адолец яе можа толькі сапраўды моцны біскуп.

**Алег Тачоны**

## Tut.by па–беларуску

Значная частка карыстальнікаў TUT.BY даўно хацела бачыць беларускамоўны інтэрфэйс нашай пошты. Як толькі гэта стала магчымым, мы зрабілі пераклад. Акрамя інтэрфэйсу ў самой скрыні, перакладзены таксама інтэрфэйс кіраўніцтва асабістым сайтам, назвы паштовых тэчак і паведамленьні пра памылкі. Каб зьмяніць мову інтэрфэйсу, трэба: 1) зайсьці ў сваю паштовую скрынку праз http://www.tut.by ці http://mail.tut.by; 2) зайсьці ў «Настройкі». Першым жа пунктам стаіць «Мова», дзе трэба выбраць «па-беларуску». Акрамя таго, у пункце «Абранае кадаваньне» трэба выбраць «Кірыліца (Windows)» і націснуць «Зьмяніць»; 3) пасьля гэтага трэба выйсьці з сваёй скрыні («Выхад») і зайсьці зноў. Адміністрацыя парталу спадзяецца, што беларускамоўным карыстальнікам спадабаецца невялікая, але вельмі прыемная сэрвіс-навіна TUT.BY.

**Кірыл Валошын, генэральны дырэктар TUT.BY**

## Гонка пачалася

Вясна дала старт прэзыдэнцкай гонцы 2006 г. Выклік, кінуты дэпутатам Уладзімерам Парфяновічам і экс-міністрам Пятром Краўчанкам, прынялі дзейныя прэзыдэнт і палітычныя партыі.

**Старонка 4.**

# Нясплачаныя даўгі

Рызыкну прадказаць, што яшчэ праз 10 гадоў Чарнобыль у Беларусі будуць згадваць ня больш, чым палякі цяпер — увядзеньне вайсковага становішча Ярузэльскім у 1981-м ці індыйцы — аварыю Бхапалу. З кожным годам чарнобыльскія акцыі прыцягваюць усё менш увагі. Грамадзтва выцясьняе траўму, гэтага псыхалягічнага працэсу не спыніць; вяртаецца аптымізм, мінуліся апакаліптычныя настроі, уласьцівыя пачатку 90-х. Малалюднасьць «Чарнобыльскіх шляхоў» не ад слабасьці апазыцыі, а праз другаснасьць нагоды. Каму хочацца сьвяткаваць дзень паразы?

Цаной адсяленьня 140 тысяч чалавек і эканамічнай дэпрэсіі, Беларусь дала рады Чарнобылю. Перажылі! Хутка па меры распаду радыенуклідаў у вёскі пачнуць вяртацца людзі, уваскрэснуць расьцярушаныя дыялекты. Адно смыліць: хоць АЭС была саюзнай уласнасьцю, Расея пераняла ўсе актывы і абавязкі СССР, акрамя чарнобыльскіх. Калі пытаньне сплаты кампэнсацый, прыпыненай у 1992 г., ня вырашыцца пасяброўску і па справядлівасьці, яно будзе псаваць беларуска-расейскія адносіны і праз 10, і праз 20 гадоў.

**Мікола Бугай**

# Чаму беларусы не багатыя

Справа Леніна—Сталіна жыве. Проста нельга не згадаць чытанага ў газэтах за 1929 год: «Замест каляд — дні ўдарнай працы ў калгасах», «25 сьнежня — 2-гі дзень індустрыялізацыі», «Рош-Гашоно» и «Иом-Кипур» — праздники мракобесов»...

У Вялікую Пятніцу, разьвітваючыся з супрацоўніцамі Нацыянальнае бібліятэкі, я нечакана даведаўся, што Пасха Хрыстова — і паводле заходняе, і паводле ўсходняе традыцыі — для іх будзе рабочым днём. І ня першы год. А што Вялікая Субота, калі каталікі йдуць у споведзь, асьвячаюць ежу, рыхтуюцца да ўсяночнае службы і адарацыі, будзе працоўным днём, — на тое мелася адмысловая пастанова ўраду.

Урад абразіў ня толькі пачуцьці каталікоў. Абражаная й Субота юдэйская. Дарма што каталікі ўвечары ў Вялікую Пятніцу моляцца за габрэяў, што ва ўсходніх хрысьціянаў (каталікоў й праваслаўных) на Сьветлай ютрані сьвятар зьвяртаецца да вернікаў як да нашчадкаў Ізраілю, што Суботу сьвяткавалі Хрыстос, апосталы ды іх вучні...

Скажуць: у пастанове ўраду ўтрымлівалася агаворка пра добраахвотнасьць працы ў суботу. Ці ж мы ня ведаем бальшавіцкіх парадкаў?

У нядзелю ўлада абражала пачуцьці і каталікоў, і праваслаўных хрысьціянаў. У Вербную нядзелю — у той дзень, калі Хрыстос выганяў з Храму гандляроў, — працавалі дзяржаўныя гандлёвыя ўстановы таксама. Ня кажучы пра піцейныя кропкі. Гэта само сабою.

Праца ў вольны ад працы дзень — гэта спараджэньне бальшавізму. Нават за прыгонам паны не наважваліся парушаць Божыя і царкоўныя ўстанаўленьні. Нават у Італіі ды Нямеччыне 1930-х да такога не дадумаліся.

Абразіўшы рэлігійныя пачуцьці сотняў тысяч людзей, тыя ж начальнікі на пачатку траўня вызваляць рабочых ад працы на 10 дзён або на два тыдні. Значыць, суботнік быў патрэбны, каб урваць з і так жабрацкіх заробкаў працоўных капейкі на «будоўлю веку» — тае самае Нацыянальнае бібліятэкі. Такі вось клопат пра духоўную культуру. Такое вось — бальшавіцкае — разуменьне культуры.



...Ды што гэта я: пра дзяржаву ды пра дзяржаву? А пра грамадзянаў? Колькі зь іх гандлявалі на базарах? Колькі зь іх рачкавалі ў гэтыя дні на сваіх гародах і лецішчах?

Атэізаваны, павярхоўна закрануты мадэрнізацыяй народ, які ня вельмі ўсьведамляе свае інтарэсы і таму ня мае іх абаронцаў — найперш дзеяздольных прафсаюзаў і партыяў, — выжывае дзякуючы «падножнаму корму». Ён нядздольны запатрабаваць ад улады выкананьня ёю ж навязанае канстытуцыі, у якой работнікам нібыта гарантуецца патрэбны для годнага існаваньня заробак. І ўлада эксплюатуе гэтую дурную працавітасьць (словы Янкі Брыля), працу пасьля працы, без выходных, на знос, на скарачэньне жыцьця...

Што зробіш, мы — не палякі і пагатоў ня немцы ці ангельцы. Тыя цьвёрда ведаюць словы апостала Паўла, што кожны павінен атрымліваць узнагароду паводле працы сваёй і ні ў чым ня мець патрэбы.

Быць працавітым і працаю сваёю ў працоўныя дні забясьпечваць сябе неабходным, сьвяткаваць дзень сёмы, прысьвячаць яго Богу, адпачываць ад працы — гэтыя загады, дадзеныя праз прарокаў і апосталаў, не парушаліся юдэя-хрысьціянскім сьветам, нават калі адбылася сэкулярызацыя грамадзтва. Тая частка юдэя-хрысьціянскае цывілізацыі, у якой цьвёрда аддзялялі дні працы й адпачынку, здолела стварыць грамадзтвы дабрабыту.

Народ, які працуе ў непрацоўныя дні, багаты ня будзе. Гэта жалезнае правіла.

**Анатоль Сідарэвіч**

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

# Прыклад Візэнталя

Сымон Візэнталь, які амаль паўстагодзьдзя прысьвяціў пошукам нацысцкіх злачынцаў, перад Вялікаднем паведаміў, што ягоная праца скончаная. «Я знайшоў забойцаў, якіх шукаў, і я перажыў іх усіх. Калі нехта і застаўся, дык ён ужо застары, каб быць пакараным». Часта рызыкуючы жыцьцём, парушаючы закон, Візэнталь адшукаў для правасудзьдзя больш за тысячу нацыстаў, у тым ліку Адольфа Айхмана.

Візэнталь у свае 94 гады дажывае ў сьціплай кватэры ў Вене (нэанацысты спрабавалі падарваць гэты дом, Візэнталь застаўся жывы, і з тае пары каля пад'езду заўжды дзяжурыць паліцыянт). Яго часта пытаюць, чаму ён прысьвяціў жыцьцё паляваньню на злачынцаў. Аднойчы ён правёў шабас у багатага ювэліра — свайго былога прыяцеля па канцлягеры Маўтгаўзэн. Пасьля абеду гэты чалавек запытаўся: «Сымоне, чаму вы не вярнуліся ў будаўнічы бізнэс? Вы б цяпер былі мільянэрам». — «Вы рэлігійны чалавек і верыце ў Бога і жыцьцё пасьля сьмерці, — адказаў Візэнталь. — І я таксама веру. Калі мы трапім у іншы сьвет і спаткаем мільёны габрэяў, што памерлі ў лягерах, і яны спытаюць нас: «Што вы зрабілі?» — адказы будуць розныя. Вы адкажаце: «Я стаў ювэлірам». Іншы скажа: «Я кантрабандаю вазіў каву і цыгарэты». Гэны скажа: «Я будаваў дамы». А я скажу: «Я вас не забыўся».

Прага справядлівасьці і абавязак памяці гэтак жа кіруюць людзьмі, як інстынкт самазахаваньня і памкненьне да ўлады. У доўгіх гадах, пражытых Візэнталем, мне бачыцца вялікая Боская ласка — даць чалавеку час ня толькі дарабіць сваю працу да канца, але і пабачыць бясслаўную сьмерць самой ідэалёгіі нацызму, закінутай на сьметнік гісторыі. Такога даўгалецьця пажадаеш любому чалавеку.

**Андрэй Дынько**

ПРЫСМАК ВЯСНЫ

# Гісторыя чарамшы



Камароўка зазелянела чарамшою. Пучок гэтага смачнага дзікага часныку каштуе 300—400 рублёў. Давозяць чарамшу з поўдня краіны: на поўначы яна амаль не расьце. Гэтая расьліна, насельніца вільготных ельнікаў, альшанікаў, дуброваў, занесеная ў Чырвоную кнігу. Апошнія гады чарамшы на менскіх кірмашах горы, яна трапляе нават у некаторыя гароднінныя крамы сталіцы. Або яе разраслося столькі, што можна з Чырвонай кнігі прыбраць, або, наадварот, хутка выражуць усю. Яе вітаміннае маладое лісьце мае лёгкі часнычны смак, надаецца да салатаў, квашаньня. А яшчэ яна пасуе да плаўленага сыру, смажанага мяса. Звычку есьці рэдкую ў нас чарамшу беларусы прывезьлі зь сібірскіх высылак: для дэпартаваных у Расею чарамша ўвесну была ратункам ад авітамінозу і цынгі. Цёплым словам яе ўспамінаюць у сваіх мэмуарах Васіль Хомчанка і Мар'ян Пецюкевіч. Калі беларускую чарамшу выедуць усю, яе можна будзе лічыць апошняй ахвярай сталінізму ў расьлінным сьвеце.

**Барыс Тумар**

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Краіна пасьля тырана

Пакуль Беларусь паволі пагружаецца ў сьвяточны вясновы одум, пакуль каталіцкі Вялікдзень плаўна пераходзіць у праваслаўны, пакуль Лукашэнка ліхаманкава рыхтуе сэмінары па ідэалёгіі й вайсковыя вучэньні, а апазыцыя замірае ў чаканьні амэрыканскага Акту аб дэмакратыі — згаслая вайна ў Іраку саступае месца хваравітаму стану «пасьля тырана».

Цудоўнае вызваленьне з эфэктам раптоўнага зьнікненьня рэжыму ўражвала нас яшчэ ў Чэхіі ў 1989-м, у Баўгарыі ў 97-м, у Сэрбіі ў 2000-м. Багдад у гэтым сэнсе мала розьніцца ад Бялграду. Таму ў апошнія тыдні менавіта Ірак без Хусэйна застаўся найцікавейшай ды найбольш паказальнай для Беларусі навіной. Сядзіш перад тэлеэкранам, міжволі ўяўляеш замест іракцаў беларусаў і дзівішся: няўжо і нашае «пасьля Лукашэнкі» будзе падобным?

Скіданьне помніка? Калякін будзе супраць, але Леніна на плошчы Незалежнасьці зрынуць пад пераможныя воклічы й зь вялікім задавальненьнем паскачуць на паверженым стодзе. Марадзёрства? У натоўпах моладзі, якія яўна будуць біць шыбы ва ўрадавых установах, знойдзецца нямала ахвочых да кампутараў і трафэяў нацыянальнага Алімпійскага камітэту. Чэргі па гуманітарку? У найлепшых традыцыях «рынкавага сацыялізму», раздача халяўных кансэрваў, шпрыцаў ды second hand (як і гандаль тымі кансэрвамі) пойдзе «на ўра». Стыхійныя мітынгі незадаволеных з патрабаваньнем вады, сьвятла, газу, хлеба й відовішчаў? Вельмі верагодна. Сваркі лідэраў апазыцыі наконт таго, хто тут галоўны змагар за дэмакратыю? Натуралёва! Напэўна, усё гэта проста непазьбежна.

Але чаго б вельмі не хацелася — каб пры гэтым вуліцы Менску патрулявалі жаўнеры зь дзьвюхгаловым арлом, каб «господа офицеры» выграбалі з касаў пачкі непатрэбных «зайчыкаў» на сувэніры, каб апазыцыйныя партыйцы на вуліцах пілі з танкістамі на брані «за дэмакратыю, за Пуціна», а якая-небудзь «часовая» адміністрацыя віншавала б грамадзянаў Беларусі зь зьвяржэньнем ненавіснага дыктатара й абяцала поўную бясьпеку ў рамках статуту ААН і канстытуцыі Расейскай Фэдэрацыі...



Кіньце! Ні Захад, ні Ўсход Беларусі ня збавяць. Гэта Эўропа, а не Ірак. І хоць сёлета нацыянальны рух выглядае як ніколі слабым ды разьяднаным, шлях у нас па-ранейшаму застаецца адзіны. Цяжкі, пакутны, ды свой.

**Павал Севярынец**

# У Іраку партызанаў ня будзе

Партызаны не вядуць рэгулярнай вайны. Яны ня носяць формы і знакаў адрозьненьня. Не бяруць палонных і нападаюць з засады.

Мяне зьдзіўляе маральная глухата людзей, якія ня бачаць паралелі паміж тым, што перажыла Беларусь, і тым, што перажывае сёньня Чачэнія. Тая самая мужная партызанская вайна за незалежнасьць. Тыя самыя зачысткі і расправы зь мірным насельніцтвам.

У Багдадзе ня будзе партызанскай вайны. П'яны амэрыканскі палкоўнік ня будзе гвалціць арабскіх дзяўчат. І амэрыкана-брытанскія войскі пакінуць Ірак і нафтавыя радовішчы іракцам. Там будзе «праамэрыканскі» ўрад, калі лічыць канстытуцыйны парадак і абарону правоў чалавека выключнай рысай амэрыканізму. Такі фінал антытэрарыстычных акцый мы ўжо бачылі ў Сэрбіі і Аўганістане.

Вайна — крывавая справа. Аднак старажытная прымаўка кажа, што «гарматы — апошні аргумэнт каралёў». Было б значна лепш, каб міжнароднае права і цывілізацыйныя нормы выконваліся аўтаматычна і не было патрэбы выкарыстоўваць збройную сілу. Пакуль гэта немагчыма. Пакуль існуюць тыранічныя рэжымы, схільныя парушаць гэтыя нормы. Аднак сьвет мяняецца на вачах. І ўсё больш прыкладаў, што любы народ ня любіць дыктатараў. І не аплаквае іх зьвяржэньня. І разумее, дзе дабро, а дзе зло.



Беларускі афіцыёз да апошняга моманту падтрымліваў і Мілошавіча, і Хусэйна. Не сказаў ніводнага слова ў абарону чачэнскага народу ад дзяржаўнага тэрарызму. Затое шмат разоў асуджаў ЗША. Гэта ўжо не падвойныя стандарты, а поўная страта маральных і палітычных арыенціраў. Асьляпленьне, якое пагражае незалежнасьці краіны і інтарэсам беларускага народу.

**Юры Хадыка**

# Масква здае Лукашэнку



## Факсы і факты

**У пятніцу ўвечары беларуская служба радыё «Свабода» перадала сэнсацыйны рэпартаж. Нібыта спэцыяльны карэспандэнт «Свабоды» знайшоў у сэйфе высокапастаўленага афіцэра на базе ірацкай нацыянальнай гвардыі, разьмешчанай на поўначы Багдаду, ліст з Барысаўскага рамонтнага заводу, непасрэдна падпарадкаванага Міністэрству абароны Беларусі. Падпісаны дырэктарам прадпрыемства, палкоўнікам Уладзімерам Сакачом, ён утрымліваў прапановы аб мадэрнізацыі танкавай тэхнікі і навучаньні вайсковых спэцыялістаў. На адваротным баку ліста была рэзалюцыя па-арабску: «Накіраваць дэлегацыю ў жніўні».**

Як паведаміла радыё, у лісьце, напісаным на заводзкім блянку й датаваным 16 чэрвеня 2001 г., вялося пра тое, што завод мае магчымасьць рыхтаваць інжынэраў (тэхнікаў) па рамонце танкавага ўзбраеньня й спэцабсталяваньня. Апроч таго, прадпрыемства было гатовае па жаданьні замоўцы распрацаваць «праграмы навучаньня па іншых спэцыяльнасьцях». Барысаўскі завод прапаноўваў інжынэрныя прыстасаваньні для расчысткі мінных палёў. У прыватнасьці: «На танк Т-55 усталёўваецца калейны мінны трал КМТ-5М. На танк Т72А, Т72Б — калейны мінны трал каткова-нажавы КМТ-7, магчымы КМТ-6». Яшчэ завод быў гатовы перадаць «указаньні па дэфармавальных афарбоўках, саставах колераў, плошчах і марках фарбаў па наступных відах камуфляжу: расьлінны, пустынна-колерны, горны, сьнежны, а таксама малюнкі дэфармавальнай афарбоўкі».

«Ніводнага балта з заводу ў Ірак ніколі ня йшло!» — катэгарычна абвяргае гэтую інфармацыю Ўладзімер Сакач. Ён паведамляе, што завод ужо дзесяць гадоў не рыхтуе вайсковых спэцыялістаў, а зьяўленьне ў Багдадзе тае «падробкі» тлумачыць «інтрыгамі» з мэтай «падарваць дзелавую рэпутацыю» прадпрыемства. Прычым інтрыгамі беларускімі, а не замежнымі. Цікава, хто ж у нас сьмелы складаць канкурэнцыю прадпрыемству Мінабароны. Подпіс на дакумэнце і сапраўды падобны на Сакачоў. Мо зь якога іншага дакумэнту ці факсу зьнялі — мяркуе палкоўнік.

Салідарны зь ім і Леанід Рачэнка, начальнік бранятанкавага ўпраўленьня Мінабароны. «Факс зьяўляецца фальшыўкай, — заявіў ён. — 140-ы завод мае свае замежнагандлёвыя сувязі толькі праз спэцэкспарцёраў». А таму ніякіх факсаў у Ірак дасылаць ня мог. Але прапанова й не была накіраваная непасрэдна Садаму Хусэйну. Ліст адрасаваўся Ўладзіславу Рачкевічу — кіраўніку беларуска-швайцарскай фірмы «Сыстэмнае кіраваньне бізнэсам», што мае офіс у Менску. Пры канцы стаяла просьба да Рачкевіча ўдакладніць маркі патрэбных тавараў.

Адным з заснавальнікаў таямнічай фірмы «Сыстэмнае кіраваньне бізнэсам» зьяўляецца «Інфабанк» — структура, што, як паведамляюць расейскія «Известия», якія прысьвяцілі скандалу вялікі артыкул, «цесна кантактуе зь беларускай Радай бясьпекі». «Інфабанк» і яго даччыныя ці заснаваныя зь ягоным удзелам прадпрыемствы актыўна дзейнічалі ў даваенным Іраку. Польскі часопіс «Упрост» нават называў яго «пральнай машынай», якая адмывае сродкі, атрыманыя ад паставак зброі ў Ірак.

Гандаль зброяй і запчасткамі, пішуць «Известия», мог фармальна ажыцьцяўляцца ў рамках гуманітарнай праграмы ААН «Нафта ў абмен на харчаваньне»: «Яна дазваляла Іраку прадаваць некаторую абмежаваную колькасьць нафты для закупак мэдыкамэнтаў, харчаваньня і іншых прадметаў першай неабходнасьці. Аднак беларусы, відаць, бліскуча адпрацавалі розныя фіктыўныя схемы, паводле якіх афіцыйна ў Ірак пастаўлялася адно — «харчаваньне», — а насамрэч зусім іншае».

Цяпер ангельска-амэрыканская кааліцыя выступае за найхутчэйшае згортваньне згаданай праграмы ААН. Расея ж прапануе не сьпяшацца: у яе кампаній таксама былі цэлы шэраг кантрактаў у рамках гэтай праграмы.

У.Рачкевіч катэгарычна абвяргае сувязі яго фірмы з Іракам, з гандлем зброяй з Іракам, з знойдзеным у сэйфе дакумэнтам, хоць прызнае, што зьяўляецца сябрам таварыства беларуска-іракскай дружбы. Дый у Іраку бываў неаднаразова. Апошні раз — летась у сьнежні, у складзе дэлегацыі, якую ўзначальваў намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Мікалай Іванчанка. Яшчэ Рачкевіч кляўся, што ніводнага разу ня быў на Барысаўскім заводзе, а дакумэнт папросту сфабрыкаваны.

Але карэспандэнт радыё «Свабода» Рон Сынавіц, прыкамандзіраваны да 3-й пяхотнай дывізіі ЗША, які й знайшоў той факс у Багдадзе, катэгарычна ня згодны з гэтым: «На базе, дзе быў знойдзены ліст, яшчэ і знаходзілася вайсковая тэхніка і запчасткі да яе. А ў лісьце менавіта і вядзецца пра рамонт вайсковай тэхнікі. Дарэчы, у гэтым жа пакоі былі валізкі і зь іншымі дакумэнтамі, выглядала, што іх склалі, каб забраць, але не хапіла часу». Падазрона: як сярод такое масы дакумэнтаў амэрыканскі карэспандэнт здолеў адшукаць той барысаўскі факс?

Старшыня камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бясьпецы савету рэспублікі Мікалай Чаргінец разглядае гэты скандал як палітычны шантаж у дачыненьні да краіны. Дапускаючы, што факс — не падробка, ён адзначыў: «Уявіце сабе пані, якая напісала цыдулку некаму з знаёмых, дзе распавяла крыху пра сваю зьнешнасьць ці яшчэ пра што. І раптам яе цыдулку знаходзяць у бардаку і пачынаюць вінаваціць пані чорт ведае ў чым». Факс, як сказаў Чаргінец, — «звычайная рэкляма таго, што робіць завод». Тое, што ліст тычыўся іракскіх уладаў, дэпутат адмаўляе. Але не выключае магчымасьці, што «нейкі жулік» мог ім прадаць нашу зброю. Вэрсію пра спробу «падрыву дзелавой рэпутацыі» заводу з дапамогай таго факсу Чаргінец прымае. Прычым кажа, што ініцыятыва магла зыходзіць ня толькі зь Беларусі, але і з Расеі.

Заходнія спэцслужбы маюць зьвесткі пра тое, што Беларусь была пасярэдніцай у часе паставак у Ірак расейскай, украінскай ды ўласна беларускай зброі, піша галоўны рэгіянальны прадстаўнік «Jane's Intelligence Digest». 12 студзеня 2003 г. у Бэйруцкім аэрапорце быў затрыманы груз зь Беларусі, прызначаны для Іраку. За падробленымі дакумэнтамі хаваліся 12 тонаў вайсковага абсталяваньня — у тым ліку 600 шлемаў, 240 бяздротавых перагаворных прыстасаваньняў для экіпажу танка і г.д. Афіцыйны Менск грузу не прызнаў, дапусьціўшы, што Беларусь таксама была краінай транзыту.

Дваццаць іракскіх афіцэраў СПА два гады вучыліся кіраваць ракетнымі комплексамі С-300 пры Беларускай вайсковай акадэміі. Месяц вучобы кожнага каштаваў 2000 даляраў. Беларусь таксама дапамагала Іраку пераабсталёўваць СПА — паведамляе «Jane's Intelligence Digest».

Беларусь ужо некалькі гадоў таму ўвайшла ў дзясятку найбуйнейшых экспарцёраў зброі. Паводле дадзеных Швэдзкага міжнароднага інстытуту дасьледаваньняў сьвету (ШМІДС), за 1997—2001 г. Менск прадаў узбраеньняў на суму, большую за паўтара мільярда даляраў. І далёка не заўсёды ў поўнай згодзе з нормамі міжнароднага права. «І з інтарэсамі суседзяў», — з крыўдаю акцэнтуюць «Известия». Так, у 1995 г. Беларусь прадала элемэнты комплексу С-300 амэрыканскай кампаніі, што працавала ў цесным кантакце з амэрыканскімі спэцслужбамі. Тады сама ў ЗША былі прададзеныя і два зьнішчальнікі Су-27. Абодва гешэфты выклікалі незадавальненьне Расеі, бо рабіліся ў абыход яе. Пасьля Беларусь перахапіла ў расейскага «Расузбраеньня», як паведамляе ў сваім дакладзе ШМІДС, кантракт на пастаўку ў Пэру васямнаццаці самалётаў МіГ-29 і гэтулькі сама Су-25.

Расейскія абароншчыкі прапаноўвалі Менску (як і Кіеву) дамовіцца пра нейкія адзіныя правілы гульні на рынку, аднак прапановы засталіся без увагі. Кожны пільнаваўся сваёй карысьці. «Известия» актуалізуюць і ўпартыя чуткі пра тое, што «беларускі канал мог быць выкарыстаны некаторымі прадстаўнікамі расейскага ВПК» для экспарту зброі дыктатарскім і тэрарыстычным рэжымам. Прычым рабілася гэта, як паведамляецца, «у абыход Крамля». Вось табе і пуцінскі парадак.

У Вашынгтоне абяцаюць у найбліжэйшы час абнародаваць як сапраўдныя зьвесткі пра беларускі гандаль зброяй з краінамі-«ізгоямі», так і інфармацыю пра таемныя рахункі Аляксандра Лукашэнкі. Цяжка меркаваць, ці тыя зьвесткі будуць больш пэўныя за інфармацыю пра іракскую зброю масавага зьнішчэньня.

«Час пакажа, якую цану заплаціць Беларусь за тое, што яе аўтарытарны лідэр падтрымлівае сумнеўныя палітычныя сувязі і гандлюе зброяй у абход міжнародных санкцый, — грозна падсумоўвае «Jane's Intelligence Digest». — Зьмена рэжыму ў Менску, магчыма, не за гарамі».

Беларусь у дзясятцы экспарцёраў зброі, а грамадзкасьць краіны ня ведае, куды тыя грошы пайшлі. У дэмакратычных краінах тая інфармацыя звычайна адкрытая. А наша сакрэтнасьць робіць заявы пра «замежныя рахункі» цалкам абгрунтаванымі.

Даказаць сапраўднасьць факсу гэтак жа цяжка, як і абвергнуць. Братаньне з Багдадам падарвала пазыцыі Менску на міжнароднай арэне, параўёўшы краіну ў шэраг адкрытых непрыяцеляў Амэрыкі. Як паказвае публікацыя ў «Известиях», якія дэфакта адлюстроўваюць пазыцыю расейскага ўраду і спэцслужбаў, Масква гатовая здаць свайго менскага пратэжэ.

**Мікола Бугай**


Министэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
140 рамонтны завод

Министерство обороны Республики Беларусь
Республиканское унитарное предприятие
140 ремонтный завод

Вниманию господина Рачкевича В.С.

Уважаемый Владислав Станиславович,

п.6. О возможности обучения специалистов
Завод имеет возможность обучать специалистов по готовым программам:
1. инженер (техник) по ремонту силовых установок,
2. инженер (техник) по ремонту вооружения танка,
3. инженер (техник) по ремонту электроспецоборудования танка.

С уважением,
Начальник УП «140 ремонтный завод» Сакач В.Ф.

## Рэйтынг Лукашэнкі падае

**Рэйтынг Аляксандра Лукашэнкі, паводле зьвестак НІСЭПД, зьнізіўся да 26,6%.** Абсалютная большасьць апытаных выступае супраць увядзеньня канстытуцыйнае магчымасьці застаецца на пасадзе прэзыдэнта на трэці тэрмін.

## Асвальда Пая — кандыдат ад МФ



**«Малады фронт» зьбірае подпісы прафэсараў за вылучэньне на Нобэлеўскую прэмію міру кубінскага дысыдэнта Асвальда Пая Сардыньяса** (толькі прафэсары гуманітарных спэцыяльнасьцяў маюць права вылучаць на гэтую прэмію). Сардыньяс — лідэр дэмакратычнае апазыцыі на Кубе. За кубінца падпісаліся ўжо С.Шушкевіч, Р.Гарэцкі, А.Грыцкевіч, А.Мальдзіс ды інш. У сярэдзіне чэрвеня подпісы трапяць у Нобэлеўскі камітэт і пасольства Кубы.

## Судзяць вэртыкальшчыкаў

**Пракуратура Берасьцейскай вобласьці ўзбудзіла справу супраць кіраўніка дарагічынскай вэртыкалі Сяргея Мамацюка.** Чыноўніку інкрымінуюць злоўжываньне службовымі паўнамоцтвамі: нібыта прымусіў старшыню калгасу набыць па завышанай цане хату свайго сына. Колькі гадоў таму Мамацюка ўжо «прыцягвалі», але тады справу прыпынілі. У Магілёўскай аблпракуратуры разглядаюць справу старшыні Краснапольскага райвыканкаму Сямёна Казлова. Яму закідаюць крадзеж чарнобыльських сродкаў. А ў Воршы і Сяньне ў адстаўку адправілі кіраўнікоў міліцыі.

## Пілёты вяртаюцца зь Нігерыі

**12 чалавек экіпажу гомельскага Ту-154 вызваленыя з «гатэльнага палону» ў нігерыйскім Лагасе.** Гаспадар гатэлю, у якім роўна месяц утрымліваліся 10 пілётаў і дзьве бортправадніцы, атрымаў 25 тыс. даляраў за паслугі. Пасьля таго як пілёты агледзяць самалёт — ці не сапсаваўся, — яны адлятуць у Беларусь. Турыстаў, якія меліся ляцець тым рэйсам, на борце ня будзе.

## «Магілёў-2» спыніў вяшчаньне

**У сераду апошні раз выйшлі ў этэр «Гарадзкія навіны» рэгіянальнага недзяржаўнага тэлеканалу «Магілёў-2».** У сакавіку, на падставе «адсутнасьці гігіенічнай рэгістрацыі тэхнікі», у тэлестудыі сканфіскавалі абсталяваньне. Тэлеканал тым ня менш працягваў карыстацца апаратурай і меў надзею выкупіць яе. Аднак зь Менску загадалі тэхнікі не аддаваць.

**СМ**

## Чарнобыльская малітва

**26 красавіка**, у дзень Чарнобыльскай трагедыі, адбудзецца памінальная Багаслужба ў касьцёле Сьв.Сымона і Алены, што на плошчы Незалежнасьці ў Менску. Пачатак аб 11-й. У гомельскім Цэнтральным сквэрыку ў гэты дзень адбудзецца Гадзіна Смутку — ушанаваньне памяці ахвяраў Чарнобылю. Пачатак а 18-й. Галоўны ж «Чарнобыльскі Шлях» стартуе ў Менску з пл.Якуба Коласа а 16-й.

# Гонка пачалася

Працяг са старонкі 1.

Аляксандар Лукашэнка напярэдадні Дня касманаўтыкі распачаў доўгатэрміновую піяр-кампанію пад назвай «беларуская касьмічная праграма», што мае скончыцца ў 2006 г. запускам першага беларускага касьмічнага спадарожніка (вагой 150 кг, прызначанага для «зандаваньня зямной паверхні»).

Нацыянальны камітэт Аб'яднанай грамадзянскай партыі заявіў пра намер вылучыць партыйнага кандыдата на выбарах 2006 г. Лібэралы будуць настойваць, каб менавіта ён стаўся адзіным кандыдатам ад апазыцыі. Анатоль Лябедзька вызначыў прамежкавую задачу кандыдата ад АГП як дасягненьне найвышэйшага сярод апазыцыйных палітыкаў рэйтынгу. Лідэр АГП і мае вялікія шанцы стаць кандыдатам у прэзыдэнты ад лібэралаў. Перад мінулымі выбарамі ўсплывала таксама больш кампрамісная кандыдатура ягонага намесьніка Аляксандра Дабравольскага.

Што датычыць выбараў парлямэнцкіх, дык Павал Данэйка на паседжаньні Нацкаму заклікаў да стварэньня адзінага апазыцыйнага блёку «ад Парфяновіча да БНФ і крайне правых». Ён прапанаваў утварыць адзіны фронт з 110 кандыдатаў «першага эшэлёну» і 110 запасных, якія пойдуць на выбары. Паводле ягоных словаў, такая апазыцыя можа быць і дэцэнтралізаванай, але толькі пры ўмове яе стварэньня «адкрыецца доступ да фінансаў унутры краіны і за межамі».

Адначасова з АГП пра свой намер удзельнічаць у парлямэнцкіх выбарах і вылучыць свайго кандыдата на прэзыдэнцкіх заявіла і Партыя БНФ. БНФ разьлічвае на сваю вядомасьць, а таксама на імідж цьвёрдае апазыцыйнасьці. Імя патэнцыйнага кандыдата не называецца, але, мяркуецца, ім мог бы стаць як цяперашні лідэр партыі Вінцук Вячорка, так і хтосьці зь вядомых інтэлектуалаў, якіх у кіраўніцтве БНФ шмат.

Сацыял-дэмакраты Міколы Статкевіча зрабілі новыя крокі, накіраваныя на раскрутку свайго лідэра. Яны адкідаюць магчымасьць далейшага супрацоўніцтва з вылучэнцамі намэнклятуры, што адпрацавалі свой рэсурс. На думку сацдэмаў, асноўная роля ў гонцы-2006 будзе належаць партыйным структурам, што вытрымалі выпрабаваньне дзесяцьцю гадамі існаваньня ва ўмовах аўтарытарызму. Калі на выбары пойдзе Мікола Статкевіч, дык ня выключанае альтэрнатыўнае вылучэньне і ягонай апанэнткі па сацыял-дэмакратычным руху, а ў мінулым — прафсаюзнай дзяячкі Валянціны Палевіковай.

Кандыдатам ад Партыі камуністаў беларускай напэўна стане Сяргей Калякін, у якога за плячыма досьвед удзелу ў кампаніі 2001 г. Ягоныя пазыцыі ўзмацніліся пасьля перамогі 166 кандыдатаў-камуністаў на мясцовых выбарах. Прычым калі АГП мае моцныя структуры на ўсходзе краіны, а БНФ — на захадзе, ячэйкі ПКБ раўнамерна разьмеркаваныя па краіне. Левая партыя ў апошні час адмовілася ад радыкальных пастулятаў. Яна прымае прыватную ўласнасьць, не настойвае на дыктатуры пралетарыяту і не зьбіраецца скасоўваць нацыянальную незалежнасьць, у адрозьненьне ад прафбоса Аляксандра Ярашука, што агрэсіўна выкарыстоўвае прарасейскую рыторыку.

Нягледзячы на пэрыядычную зачыстку палітычнага поля, Лукашэнка па-ранейшаму мае сур'ёзных прынцыповых апанэнтаў.

**МБ**

# Сход дэмакратычных дэпутатаў

Пра аб'яднаньне дэпутатаў-дэмакратаў пачалі гаварыць адразу пасьля сакавіцкіх выбараў. Лідэр БНФ Вінцук Вячорка прапанаваў стварыць Канвэнт дэмакратычных дэпутатаў, а кіраўнікі АГП — Міжрэгіянальную дэпутацкую групу. Кожная з названых партый спачатку зьбірала сваіх дэпутатаў асобна. Нарэшце прынятае рашэньне склікаць агульны сход дэпутатаў мясцовых саветаў. Ён адбудзецца ў Менску 10 траўня. Марат Афанасьеў (Жлобін, АГП) кажа, што гэтаму рашэньню папярэднічалі шматлікія кансультацыі з удзелам сяброў АГП, БНФ і БСДП (НГ). Прапанову далучыцца атрымалі і камуністы з ПКБ.

Паводле словаў Алеся Міхалевіча (Пухавічы, БНФ), на сходзе дэпутаты будуць дзяліцца досьведам. Многія маюць што расказаць. Напрыклад, Афанасьеў у 1990 г. быў старшынём Жлобінскага райсавету, а пра дэпутата Пухавіцкага райсавету, сябра БНФ Васіля Валасюка і досьвед яго працы ў якасьці народнага абраньніка пісала нават прэзыдэнцкая «Беларуская думка». У сходзе возьмуць удзел каля 50 дэпутатаў — партыйцаў і беспартыйных.

**Алег Тачоны**

### ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Супэрплуг

**Міноўтаўскі рамонтны завод (Лідскі раён) выпускае выпрабавальную партыю пяцікорпусных плугоў.** Навінка абсталяваная корпусамі з аўтаматычнай абаронай, што забясьпечвае так званую «гладкую» арбу без баразнаў. Сыстэма абароны дазваляе плугу абыходзіць камяні і іншыя перашкоды ды вяртацца ў зыходны стан. Ставіць яго будуць на трактары «Беларус». Плуг дазволіць эканоміць на кожным апрацаваным гектары да 4 літраў паліва. Налета завод плянуе рабіць да тысячы гэткіх плугоў у год.

## Нацыяналізацыі ня будзе

**Палата прадстаўнікоў адхіліла** народжаны ў прэзыдэнцкіх структурах праект закону «Аб нацыяналізацыі».

## Лёгкая рэгістрацыя

**Сёлета можа зьмяніцца парадак рэгістрацыі юрыдычных асобаў ды прадпрымальнікаў.** Неўзабаве ў палату прадстаўнікоў будзе ўнесены праект закону, які прадугледжвае заяўляльны, а не дазваляльны парадак рэгістрацыі. Калі закон пройдзе, дзяржава згубіць права адмовіць у рэгістрацыі. Створаць адзіны рэгістрацыйны орган замест сёньняшніх 16, а ліквідаваць юрыдычныя асобы зможа толькі гаспадарчы суд.

## Перавозчыкам палёгка

**Расейскі дзяржаўны мытны камітэт на няпэўны час прыпыніў дзеяньне свайго загаду,** згодна зь якім беларускія перавозчыкі мелі права дастаўляць свае грузы толькі на 9 складаў вакол Масквы. Тыя правілы ставілі беларусаў у дужа нявыгадныя ўмовы ў параўнаньні зь перавозчыкамі з іншых краінаў.

## Аварыя ў банку

**14 красавіка ў 16.30 зламаўся галоўны кампутарны сэрвэр «Беларусбанку».** Рамантавалі яго да 4-й раніцы. Высьвілася, што ў найбуйнейшага банку краіны няма запаснога сэрвэра. Добра, што аварыя адбылася ў фактычна непрацоўны час, інакш міжбанкаўскія разьлікі былі б спыненыя.

**АК**

### З УСЁЙ КРАІНЫ

## Taran siarod nočy

**Siarod nočy ŭ chatu na T-padobnym skryžavańni vul.Bieraściejskaj i Prytyckaha ŭjechała inšamarka.** Napałochała haspadaroŭ dy razburyła cahlanuju ścianu siencaŭ. Kiroŭca, vidać, prysnuŭ i na chutkaści źbiŭ płot dy prataraniŭ budynak. Heta ŭžo čaćvierty taki vypadak z hetaj chataj.

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**

## Дзякуй Кулангоўскім і Ярашам

**На Вялікдзень віншаваньне ў Лёндан паляцела з Кабыльніку, што ля возера Нарач.** Ксёндз мясцовай парафіі айцец Бярнард дзякаваў сем'ям Кулангоўскіх і Ярашаў за дапамогу беларускім дзецям. Зьбіралі тыя сродкі цікава: урадженка Кабыльніку пані Сабіна Кулангоўская папрасіла гасьцей не прыносіць на яе дзень народзінаў падарункі, а лепей — ахвяраваньні для дзетак. На тыя грошы набылі для дзятвы Мядзельшчыны й Пастаўшчыны вопратку і абутак.

**Алесь Высоцкі, Мядзел**

## «Адпачыў»

**Рабункі гандлёвых кропак у Аршанскім раёне набылі ў апошні час рысы сапраўднай эпідэміі.** Летась злодзеі спакушаліся на кожную трэцюю вясковую краму. Звычайна сьледчым даводзілася шукаць злачынцаў па сьлядох. Але адной красавіцкай раніцай у краме вёскі Высокае міліцыя знайшла злодзея. Зьбітыя



IREX-PROMEDIA

замкі на дзьвярах, паўнюткія торбы тавараў, падрыхтаваны да вынасу, пустыя бутэлькі з-пад віна й гарэлкі — усё сьведчыла супраць яго. Злодзея пабудзілі і дапыталі. Як высьветлілася, у краму ўлезьлі ўтрох. За шчасьлівае сканчэньне «апэрацыі» кампанія тут жа добра выпіла й закусіла. І калі два змаглі пайсьці на сваіх нагах і нават з торбамі накрадзенага, дык трэці вырашыў адпачыць перад дарогай. І папаўся. Цяпер уся тройца паўстане перад судом.

## Новая газэта

**Выйшаў першы нумар новай аршанскай газэты «Віцебская трыбуна. Аршанскі рэгіён».** Заснавальнікам штотыднёвіка стаў Цэнтар маладзёвых ініцыятываў «Контур». Надрукаваная яна ў Віцебску накладам 800 асобнікаў. Зьмяшчае матэрыялы на беларускай і расейскай мовах зь перавагай апошняй. Большасьць аўтараў — былыя супрацоўнікі вэртыкальнай «Аршанскай газэты». Застаецца толькі спадзявацца, што новую, незалежную ад уладаў газэту не спасьцігне лёс яе папярэдніц. Апошняя зь іх, «Время» («НН» пісала пра яе ў нумары ад 7 сакавіка), выдала ўсяго два нумары — нулявы ды першы.

## Багатыя таксама ня плацяць

**Да таго, што за кватэру своечасова не разьлічваюцца незаможныя аршанцы, на жыльлёва-эксплюатацыйных участках ужо прызвычаіліся.** Але ёсьць неплацельнікі, якіх беднымі ніяк не назавеш. Ёсьць у Воршы нават банкір і прадпрымальнік, вінныя камунальнікам за паўгоду. Дзевяць месяцаў не плаціў за камунальныя паслугі старшыня Аршанскай райспажыўкаапэрацыі. Ледзь не ўсяму калектыву ЖЭУ давялося ўгаворваць яго (бо ж начальнік!) аплаціць рахункі. Толькі пасьля гэтага той дaручыў асабістаму кіроўцу зьезьдзіць у касу ды разьлічыцца.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

### ФУТБОЛ

## Тэлевізара не атрымаў ніхто

**У пятніцу 18 красавіка бабруйская «Белшына» прымала чэмпіёна краіны — барысаўскі клюб БАТЭ.** У першым тайме каманды змагаліся за мяч у цэнтры поля, амаль не б'ючы па варотах. На таблё сьвяціліся сумныя нулі. У перапынку было абвешчана, што футбаліст, які адкрые лік, атрымае тэлевізар «Гарызонт». Гэтая навіна вельмі ўзрадавала заўзятараў на стадыёне, яны пачалі актыўна «жадаць», каб тэлевізар застаўся ў Бабруйску. Ды фінальны сьвісток арбітра так і зафіксаваў нулявую нічыю. Аднак расчараваных пасьля гульні не засталося, бо «Белшына» ніздрэнна паказала сябе перад моцным супернікам.

**Аляксей Кулявец, Бабруйск**

# Агент Нож

**Брытанскую грамадзкую думку ўскалыхнула паведамленьне пра змову спэцслужбаў з пратэстанцкімі тэрарыстамі Ольстэру. Апроч стрэлаў у сьпіну ірляндзкім тэрарыстам і допытаў з катаваньнямі, у пераліку «грахоў» брытанскай выведкі падчас вайны ў Паўночнай Ірляндыі зьявіўся новы пункт — агенты-тэрарысты, што ўчынялі забойствы з дазволу дзяржавы, калі не на яе загад.**



Сярод кіраўніцтва ІРА ёсьць супрацоўнік брытанскай выведкі. На ягоным сумленьні — сорак бязьвінных ахвяраў.

У 80-х — пачатку 90-х брытанскія спэцслужбы дапамагалі пратэстанцкім тэрарыстам у Паўночнай Ірляндыі забіваць бязьвінных каталікоў. Таксама яны паблажліва назіралі за тэрарыстычнай дзейнасьцю таемнага агента на мянушку «Stakeknife», які, напэўна, да сёньня займае месца ў кіраўніцтве Ірляндзкай рэспубліканскай арміі. Такія высновы зрабіў пасьля 14 гадоў афіцыйнага расьсьледаваньня найвышэйшы камісар паліцыі Джон Стывэнз.

Ягонай мэтай было высьвятленьне абставінаў зьнішчэньня 26 каталікоў, у тым ліку скандальнага забойства вядомага адваката Пэта Файн'юкейна. Той бараніў у часе судовых працэсаў чальцоў ІРА, сярод якіх быў, напрыклад, легендарны ўдзельнік галадоўкі Бобі Сандз. У лютым 1989 г. Файн'юкейна забілі 14 кулямі проста падчас сямейнай вячэры на вачах жонкі і траіх дзяцей.

Адказнасьць за забойства ўзялі на сябе тэрарысты з арганізацыі «Ulster Defense Association» (Ольстэрская абаронча асацыяцыя — ОАА). Кіраўніком выведкі ОАА ў той час быў брытанскі агент Браян Нэльсан, які даў забойцам фатаздымкі ахвяры. Зброю кілерам выдаў іншы агент — Уільям Стоўбі. Брытанскім агентам быў і адзін з кілераў. Нэльсан, аднак, лічыў, што забіваць Файн'юкейна ня трэба, і спрабаваў папярэдзіць сваё начальства з брытанскай разьведкі аб тым, што рыхтуецца замах. Але паліцыя не перашкодзіла тэрарыстам.

Двума тыднямі раней тагачасны кіраўнік МУС Дуглас Гог зьвінаваціў Файн'юкейна ў супрацоўніцтве з ІРА. Міністра ўвялі ў зман фальшывыя дакумэнты: Файн'юкейн не ўваходзіў у ІРА, ён бараніў таксама пратэстантаў. Удава адваката Джэральдына ў адным зь нядаўніх інтэрвію так выказалася пра мужа: «Ён быў незалежным адвакатам. Згадзіўся б абараняць, напэўна, нават сваіх забойцаў».

Абодва брытанскія агенты, адказныя за забойства Файн'юкейна, ужо не жывуць. Стоўбі забілі пратэстанты ў чэрвені 1999 г., Нэльсан тыдзень таму памёр ад раку лёгкіх.




На думку камісара Стывэнза, да злачынства маюць дачыненьне значна вышэйшыя асобы. Камісар зьвярнуўся ў пракуратуру па ордэр на допыт дзевяці брытанскіх афіцэраў, у тым ліку Маргарэт Уолшаў, агенткі выведкі, якая «вяла» Нэльсана. У той час яна была сэржантам. А ў 1998 г. ужо капітан Уолшаў атрымала з рук каралевы мэдаль за заслугі.

У сваёй справаздачы камісар Стывэнз вінаваціць Міністэрства абароны ў спробах утойваньня дакумэнтаў, дамагаецца таксама расьсьледаваньня прычын таямнічага пажару ў офісе ягонай камісіі 12 гадоў таму. Як пісалі газэты, офіс спаліў таемны аддзел вайсковай выведкі, інсцэнаваўшы пажар ад недапалка.

Камісар Стывэнз жадае таксама пагутарыць з тым тайным брытанскім агентам у кіраўніцтве ІРА, што хаваецца пад псэўданімам «Stakeknife» («Нож»). Як сьцьвярджаюць крыніцы сярод СМІ Бэлфасту, на гэтым агенце — кроў 40 ахвяраў: невінаватых мінакоў, жанчын і дзяцей, што загінулі ў часе тэрактаў. Ёсьць падозраньне, што дзеля выратаваньня гэтага агента брытанская выведка ахвяравала жыцьцём бязьвіннага пэнсіянэра з Бэлфасту Францыска Натарантоніё, забітага ў 1987 г. пратэстанцкай узброенай групоўкай. Кіраўнікі ОАА хацелі тады забіць мясцовага лідэра ІРА, якім і быў, уласна, «Stakeknife». Каб яго абараніць, афіцэры выведкі навялі тэрарыстаў на іншую цэль — былога таксіста Натарантоніё, сфабрыкаваўшы дасье, згодна зь якім менавіта ён кіраваў аддзелам ІРА.

Паводле некаторых крыніц, «Stakeknife» дагэтуль дасылае рапарты брытанскім сілавікам, а ягоная асоба застаецца адной з найстражэйшых таямніцаў Аб'яднанага Каралеўства (прозьвішча агента ня згадваецца нават у дакладах для Кабінэту міністраў, у год ён зарабляе, паводле чутак, 70 тыс. фунтаў стэрлінгаў, якія пераводзяцца на рахунак у Мальце).

Пратэстанцкія сілы бясьпекі і палітыкі бароняць агентаў, кажучы, што іх паведамленьні дазволілі прадухіліць замахі на многіх каталікоў, у тым ліку на лідэра «Шын Фэйн» Джэры Адамза. Рэспубліканцы ж цьвердзяць, што шпіёнская дзейнасьць брытанцаў толькі падліла бруду ў полымя вайны й каштавала жыцьця дзясяткам нявінных людзей, правакуючы прагу адплаты і зацягваючы крывавы канфлікт. Між тым скептыкі мяркуюць, што скандал справакаваны самімі спэцслужбамі, каб пасеяць недавер між кіраўнікамі ІРА.

**СП паводле замежнай прэсы**

# Палітыка буйнога калібру

## Ахвяры палітычных забойстваў у Расеі



**Сяргей Юшанкоў быў забіты 17 красавіка. Акурат у той дзень Міністэрства юстыцыі зарэгістравала ягоную партыю «Лібэральная Расея», адначасова забараніўшы Барысу Беразоўскаму карыстацца гэтай назвай. Расейскія мэдыі адразу падкрэсьлілі сувязь паміж гэтымі падзеямі. Між тым, яна настолькі відавочная, што ажно выклікае сумнеў. Як, зрэшты, і матывы большасьці гучных палітычных забойстваў у Расеі.**

**26 красавіка 1994 г.** З помпавае стрэльбы забіты дэпутат **Андрэй Айдзэрдзіс**. Ён быў старшынём рады Міжнароднай дзелавой карпарацыі й «МДК-банку» — адной з самых магутных фінансавых структураў Хімкінскага раёну Масквы. Айдзэрдзіс быў зьвязаны з крыміналам. Казалі, што ён замовіў забойства мясцовага «аўтарытэта» Віктара Бурлачка, а таксама здаў міліцыі іншага хімкінскага аўтарытэта Рамонава, чый былы аднаклясьнік Дзьмітры Міхненка і забіў Айдзэрдзіса. Забойца дагэтуль ня знойдзены.

**1 лістапада 1994 г.** жорстка зьбіты і абрабаваны дэпутат **Валянцін Марцям'янаў**. Ён памёр у рэанімацыі. Загадчык катэдры Маскоўскай дзяржаўнай юрыдычнай акадэміі, Марцям'янаў быў сябрам фракцыі КПРФ. Апантаным апазыцыянэрам ды актыўным палітыкам ніколі не лічыўся, таму сьледчыя пастанавілі, што гэта было хоць і жорсткае, але шараговае абрабаваньне.

**2 лютага 1995 г.** у лесе пад мястэчкам Зарайск быў расстраляны дэпутат **Сяргей Скорачкін**. Афіцыйна ён займаўся прадпрымальніцтвам, аднак насамрэч быў крымінальнікам. Ён быў вядомы пад мянушкай «гарэлачны кароль». Забілі яго людзі з групоўкі Алега Ліпкіна. Самога Ліпкіна ды пяцёх ягоных людзей арыштавалі, судзілі і апраўдалі.

**26 лістапада 1995 г.** у Пятроўску-Забайкальскім застрэлены дэпутат **Сяргей Маркідонаў**, чалец дэпутацкай групы «Стабільнасьць». Калегі казалі, што забойства было палітычнае, аднак выявілася, што Маркідонава забіў, напіўшыся, ягоны ахоўнік. Працьверазеўшы ды пабачыўшы, што нарабіў, ён застрэліўся.

**У студзені 1996 г.** зьнік дэпутат **Юры Палякоў** з дэпутацкай групы «Народаўладзьдзе», старшыня краснадарскага калгасу «Кастрычнік». Ягонае цела дагэтуль ня знойдзенае. Палякоў займаўся ня толькі сельскай гаспадаркай, але і нафтавымі спэкуляцыямі. Па гэтай справе былі арыштаваны 22 чалавекі з казацкае сотні тамтэйшага атамана Сяргея Даманіна, якія на сьледзтве прызналіся, што выкралі ды забілі Палякова, займаліся вымаганьнем грошай ды нават спрычыніліся да забойства журналіста Ўладзіслава Лісьцьева. Аднак на судзе яны ўсё адмовілі.

**3 ліпеня 1998 г.** у падмаскоўнай вёсцы Клокава ў сваім доме быў застрэлены генэрал **Леў Рохлін**. Суд пастанавіў, што забойства ўчыніла ягоная жонка Тамара, ды пасадзіў яе на 8 гадоў за краты. Нядаўна Вярхоўны суд рэкамэндаваў вызваліць яе, бо ў справе шмат няяснага. Рохлін займаўся барацьбой з карупцыяй у расейскім вайсковым кіраўніцтве, ладзіў апазыцыйны рух.

**20 лістапада 1998 г.** у пад'езьдзе свайго дома ў Санкт-Пецярбурзе расстраляная з аўтамата **Галіна Старавойтава**. Разам зь ёй быў яе памочнік Руслан Лінькоў, аднак яго толькі паранілі. Старавойтава актыўна зьбірала матэрыялы пра карупцыю ў Санкт-Пецярбурзе.

**10 лютага 2001 г.** непадалёк ад свайго дому ў Маскве расстраляны дэпутат **Міхаіл Сірата**, дырэктар алтайскай птушкафабрыкі «Маладзёжная». Сьледзтва прызнала, што яго «замовіў» уласны камэрцыйны партнэр.

**21 жніўня 2002 г.** у Маскве падчас шпацыру з сабачкам забіты **Ўладзімер Галаўлёў**, калега Сяргея Юшанкова па «Лібэральнай Расеі». Сам Юшанкоў не выключаў «палітычнай вэрсіі», аднак за больш рэальную лічыў эканамічную. Дзяржпракуратура спрабавала давесьці, што Галаўлёў прысвоіў 600 мільёнаў даляраў у той час, калі ўзначальваў Чэлябінскае абласное аддзяленьне дзяржкаммаёмасьці. Галаўлёў даваў сьледчым паказаньні супраць шэрагу высокіх чыноўнікаў, якія дужа не жадалі яшчэ раз пачуць свае прозьвішчы ў судзе.

Сьпіс палітыкаў рэгіянальнага ўзроўню, забітых за гэты час, мае ўжо за 20 пунктаў. Як вынікае, найчасьцей забіваюць за грошы. У Беларусі за той самы час былі чатыры гучныя справы — Арцымені, Мікалуцкага, Захаранкі й Ганчара.

**Алесь Кудрыцкі**

## Ці ёсьць у Беларусі сэрвільнае мастацтва

**За саветамі ў кожным начальніцкім кабінэце вісеў абавязковы партрэт Леніна. У партыйных бонзаў яго дапаўняла выява чарговага «правадыра партыі», а зь сьценаў кадэбэшных і міліцэйскіх кабінэтаў пагрозьліва пазіраў «жалезны Фэлікс». Прэстыжна было мець у сябе не стандартную плякатную выяву, памножаную тысячнымі накладамі, а адмыслова намаляваны партрэт. Так, выявы Леніна аўтарства Міхаіла Савіцкага віселі ледзь ня ў кожным кабінэце ЦК КПБ. У сёньняшняй Беларусі няцяжка набыць партрэт Лукашэнкі — усьмешлівы ці больш суворы, памерам з паштоўку ці з насьценны плякат. Але ўсё гэта толькі фотавывы. Мастакі не малююць «бацькі», хаця партрэты больш дробных начальнікаў ужо ёсьць.**



IREX-PROMEDIA

**Губэрнатар Берасьцейскай вобласьці Васіль Даўгалёў ведае сваіх папярэднікаў у твар**

# Майстры параднага партрэту

На выставе Ўладзімера Гардзеенкі «Мы нарадзіліся тут», якая экспануецца ў менскім Палацы мастацтваў (да 28 красавіка), можна пабачыць партрэты кіраўнікоў Гарадзенскае вобласьці Зьмітра Арцымені і Аляксандра Дубка. Сам У.Гардзеенка кажа, што іх выявы яму замовіў аблвыканкам: «Я і Домаша маляваў. Арцыменю, праўда, не з натуры, але вось Дубко мне пазаваў, мы зь ім нагул сябравалі. Але дамалёўваць давялося ўжо пасьля ягонай сьмерці».

Ці сьведчаць гэткія «сацыяльныя замовы» пра тое, што ў нас складаецца новае сэрвільнае мастацтва? Або гэта ўсё яшчэ працяг старое савецкае традыцыі — дагаджаць уладзе?

Дырэктар Беларускага Калегіюму Алесь Анціпенка ўпэўнены, што сэрвільнае мастацтва сёньня ёсьць і дасталося яно нам у спадчыну ад савецкіх часоў: «Раз ёсьць Міністэрства культуры і няма арт-рынку, значыць, ёсьць і мастацтва, якое абслугоўвае патрэбы ўлады. Калі ёсьць манаполія на закуп твораў мастацтва, дык і мастакі вымушаныя падладжвацца пад густ дзяржаўных чыноўнікаў, якія закупляюць тыя творы. Пакуль ня ўзьнікне арт-рынак, ня будзе свабоды».

Мастак Артур Клінаў лічыць, што асэнсаванага сэрвільнага мастацтва ў Беларусі няма: «Ёсьць пэўная група мастакоў, аблашчаных уладай. Але сама гэтая група падаецца аморфнай і выпадковай. Нехта некаму патрапіўся на вочы — і быў набліжаны да ўлады. А патрапіўся б іншы — быў бы аблашчаны іншы».



IREX-PROMEDIA

**Мэханізатары-пераможцы шклоўскіх «Дажынак-2000» атрымалі свае партрэты з рук прэзыдэнта.**

### Галоўнае — шчырасьць

Праблема адносінаў паміж мастаком і ўладай, на думку мастака Аляксея Марачкіна, мае некалькі аспэктаў: «Што рабіць мастаку, сьпеваку, які нарадзіўся ў час дыктатуры? Ці яму зусім не сьпяваць, не маляваць? У савецкія часы мастакі, якія хацелі пазьбегчы стварэньня сацрэалістычных карцінаў з апяваньнем тагачаснай ідэалёгіі, малявалі пэйзажы. Прыклад гэтаму — Масьленікаў, які захаваўся як мастак нават у тыя гады.

Зусім іншая рэч, калі таленавіты чалавек апявае ўладцу, але робіць гэта шчыра, паводле сьвядомага перакананьня. За гэта яму многае даруецца… Так, у часы Француcкае рэвалюцыі Энгр маляваў узьнёслыя партрэты Напалеона. Але калі Азаронак апявае Лукашэнку, дык жа відаць, што ён проста прыслугоўвае». Мастакамі, якія спрабуюць паддобрыцца да сёньняшніх уладцаў, Марачкін называе Аляксандра Шастакова і Мікалая Апіёка: «Яны не малююць Лукашэнкі, але ствараюць партрэты Філарэта ды яго падначаленых».

Партрэты гарадзенскіх начальнікаў, створаныя У.Гардзеенкам, А.Марачкін ацэньвае досыць высока: «Паглядзіш на тыя партрэты і адчуваеш розьніцу. Там побач вісіць партрэт Сталыпіна, першага гарадзенскага губэрнатара. Сталыпін — гэта ж фігура! А тыя два чыноўнікі хоць і розныя з твару, але нечым падобныя. Ці іх гэта савецкая ўлада такімі падобнымі парабіла… Вось як выяўляецца талент мастака».

Сам У.Гардзеенка ня лічыць, што сваімі працамі абслугоўвае ўладу: «На ўсе гарадзенскія карціны дзяржава зрабіла мне замову — і што кепскага, калі ў выніку атрымаліся добрыя партрэты? Днямі выставу наведаў наш міністар замежных справаў, і яму вельмі спадабаўся менавіта партрэт Дубка. Іншым чыноўнікам беларускага і міжнароднага ўзроўню спадабаліся іншыя карціны. Але я ж маляваў ня толькі чыноўнікаў, але і мэханізатараў, і бакеншчыка, і доктара, і перасяленцаў з Чарнобыльскай зоны. Партрэт мэханізатара — пераможцы жніва — мне таксама замовіла дзяржава, і на міжнародным пленэры гэты партрэт потым заваяваў першае месца. Гэта ж добра, калі дзякуючы такім замовам ствараюцца сапраўдныя творы».

Мастак зазначае, што на ягонай выставе ёсьць ня толькі выявы «кананізаваных» чыноўнікаў, але і прыватны партрэт Валер’я Ціхіні: «Ён сам зрабіў мне замову напісаць ягоны партрэт. Перад выставай мяне перасьцерагалі: мо лепей не выстаўляць гэтай карціны. Але я лічу, што гэта варты чалавек і добры партрэт».

### Ад Балаховіча да Язерскай

Званьне «заслужанага» ці «народнага», падораная майстэрня — улада гатовая плаціць творцу вельмі шчодра. «Неабходна пазбыцца званьняў кшталту «народны», «заслужаны», бо яны маюць мала дачыненьня ўласна да мастацтва», — мяркуе мастак Аляксей Кузьміч.

Шыкоўны падарунак — пэрсанальную мастацкую галерэю — менскія ўлады нядаўна зрабілі Леаніду Шчамялёву. Гэта была плата за маўчаньне: пасьля такога падарунку Л.Шчамялёў зьняў свой подпіс пад зваротам да інтэлігенцыі сабрацца на сход. «Мастакі часта сваім замоўчваньнем нейкіх тэмаў ствараюць камфорт для ўлады і тым патураюць, прыслугоўваюць ёй», — перакананы А.Марачкін. Ён згадвае, што Л.Шчамялёў маляваў партрэты Цёткі, Яўгена Куліка, першы ў Беларусі партрэт Станіслава Булак-Балаховіча. «А на апошняй ягонай выставе, што ладзілася да юбілею, нічога гэтага ўжо не было. Затое ёсьць партрэт Элеаноры Язерскай. Чалавек адчуў каньюнктуру. Ён ня хоча непрыемнасьцяў сабе, але ж стварае і ўтульныя ўмовы для ўлады».

Ці здольная цяперашняя ўлада стварыць такую ідэалёгію, пад якую будуць падладжвацца мастакі? На думку А.Клінава, гэтага й ня трэба. Сэрвільнае мастацтва не грунтуецца на нейкай ідэалёгіі: «Гэта проста задавальненьне густаў тых людзей, якія цяпер маюць уладу. Іхныя густы былі выхаваныя ў савецкай сярэдняй школе, і цяпер гэтыя людзі хочуць бачыць вакол сябе карціны такога ж узроўню».

А.Марачкін кажа, што стварэньне дзяржаўных канонаў кшталту колішняга сацрэалізму ані сёньня, ані пазьней немагчымае: «Усе ж будуць сьмяяцца! Пагатоў, сёньня нікога не прымусіш маляваць згодна зь нейкімі аднымі правіламі».

**Аркадзь Шанскі**

# Ігар Валахановіч:
# Тэрактаў як у Нью-Ёрку ў нас не было



Ігар Валахановіч нарадзіўся ў 1971 годзе ў в. Забалацьце Дзяржынскага раёну. У 1993 г. скончыў гістарычны факультэт БДУ, пасьля тры гады працаваў настаўнікам гісторыі ў сярэдняй школе. З 1996 г. супрацоўнік КДБ, маёр. У 1998 г. скончыў асьпірантуру БДУ і падаў да абароны дысэртацыю. Прафэсар Уладзімер Міхнюк прапанаваў выдаць яе асобнай кнігай з улікам заўваг апанэнтаў. На дапрацоўку пайшлі амаль два гады. Манаграфія выйшла ў сьвет толькі летась. Кандыдат гістарычных навук.




**Пры канцы 2002 г. была выдадзеная манаграфія супрацоўніка Цэнтральнага архіву КДБ Ігара Валахановіча «Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944—53 гг.». Першая рэцэнзія на гэтую кніжку зьявілася на старонках нашай газэты (№4 за 2003 г.). Сёньня Ігар Валахановіч адказвае на пытаньні карэспандэнта «НН».**

**«НН»: Калі Вы зацікавіліся тэмай пасьляваеннага антысавецкага Супраціву?**

**І.В.:** Антысавецкім падпольлем я зацікавіўся ў 1994 г., пасьля выхаду кнігі Яўгена Сямашкі «Армія Краёва на Беларусі». У той час я таксама пазнаёміўся з публікацыямі Сяргея Жумара, Аляксея Літвіна, Аляксандра Хацкевіча. Яшчэ калі вучыўся ў асьпірантуры, рыхтаваў дысэртацыю па гісторыі «польскага пытаньня» ў замежнай палітыцы эўрапейскіх краінаў у другой палове XVIII ст. А калі прыйшоў на працу ў Цэнтральны архіў КДБ, пытаньне выбару новай тэмы майго дасьледаваньня вырашылася само сабой.

**«НН»: Ці сьведчыць выданьне Вашай і падобных кніг, што часы замоўчваньня пасьляваеннай антысавецкай барацьбы мінаюць?**

**І.В.:** Гэтыя часы скончыліся з выхадам у сьвет працы пад аўтарствам міністра Л.Цанавы ў канцы 1940-х, дзе ўпершыню былі выкарыстаны дакумэнты з архіву тагачаснага МДБ. Іншае пытаньне, што надрукаваныя там факты зь сёньняшняга погляду падаюцца заідэалягізаванымі і аднабокімі ў сваёй трактоўцы. А вось праца А.Салаўёва, прысьвечаная Беларускай цэнтральнай радзе (выйшла ў Менску ў 1995 г. — **СЁ**), на мой погляд, дакладна і аб’ектыўна дае адказы на большасьць пытаньняў, зьвязаных зь дзейнасьцю беларускіх нацыяналістаў падчас другой сусьветнай вайны і ў першыя паваенныя гады.

**«НН»: «Вестник КГБ Республики Беларусь» піша, што ў 1946 г. у вышуку знаходзіліся дзясяткі тысячаў людзей, якія альбо супрацоўнічалі зь нямецкімі акупантамі, альбо былі сябрамі беларускіх патрыятычных арганізацыяў. Ці многіх органы не змаглі выявіць? Кагосьці шукаюць да сёньня?**

**І.В.:** Заўважу, што, на мой погляд, сябры «беларускіх патрыятычных арганізацый» у крымінальным вышуку не былі. Да адказнасьці прыцягваліся ўдзельнікі беларускіх калябаранцкіх арганізацый і партый, створаных нямецкімі акупацыйнымі ўладамі. Магу сьцьвярджаць, што ўсіх калябарантаў, якія засталіся ў СССР альбо былі туды накіраваныя пасьля вайны заходнімі спэцслужбамі, органы дзяржбясьпекі выявілі. Многія ж калябаранты і ўдзельнікі карных фармацый эміգравалі на Захад. Але і там добра разумеюць розьніцу паміж патрыятызмам і калябаранцтвам. Я пэўны, што справа былога грамадзяніна Вялікабрытаніі Саванюка, які некалькі гадоў таму быў асуджаны за ўдзел у карных акцыях фашыстаў на тэрыторыі Беларусі ў гады вайны, — гэта не выключэньне, а толькі пачатак.

**«НН»: На пачатак сакавіка прыпадалі 60-я ўгодкі з дня забойства ў Менску лідэра беларускіх нацыянал-сацыялістаў Фабіяна Акінчыца. Дагэтуль ідуць спрэчкі, хто арганізаваў гэты тэракт: савецкія партызаны ці Беларуская незалежніцкая партыя.**

**І.В.:** Аляксей Салаўёў у сваёй кнізе «Они действовали под разными псевдонимами» на падставе архіўных крыніцаў даводзіць, што тэракт зьдзейсьнілі байцы спэцгрупы НКДБ БССР «Мсьціўцы». Дадам, што мне невядомая ніводная антыфашысцкая акцыя БНП.

**«НН»: Цяпер у Польшчы рыхтуецца да друку творчая спадчына юрыста, публіцыста і палітыка Міколы Шкялёнка. З эміграцыйных крыніцаў вядома, што ў 1945 г. ён быў арыштаваны органамі дзяржбясьпекі. Як склаўся яго далейшы лёс?**

**І.В.:** У сваёй працы я прывёў факт, што ў чэрвені 1945 г. ён атрымаў ад кіраўніка БНП Усевалада Родзькі заданьне накіравацца з Варшавы ў Бэрлін. Далей прасачыць яго лёс мне не ўдалося. Але, наколькі мне вядома, Шкялёнак ня быў арыштаваны органамі дзяржбясьпекі.

**«НН»: Шкялёнак — не адзіны, лёс якога застаецца невядомым. У першыя паваенныя гады ў турму НКДБ трапіў зь Нямеччыны мовазнаўца Мікола Байкоў, у пачатку 1970-х зьнік пасьля вяртаньня з эміграцыі паэт Уладзімер Дудзіцкі (Гуцька). Ці можаце штосьці сказаць і пра гэтых асобаў?**

**І.В.:** На жаль, пра лёс М.Байкова і У.Дудзіцкага я нічога ня ведаю.

**«НН»: Дасьледчыкі згадваюць пра існаваньне ў паваенныя гады спэцгрупаў МДБ, якія дзейнічалі пад выглядам «лясных братоў»…**

**І.В.:** Пра гэта пісаў у сваёй манаграфіі і я. Стварэньне «легендаваных» спэцгрупаў не супярэчыла савецкаму заканадаўству. Гэта быў адзін з мэтадаў апэратыўнай працы органаў дзяржбясьпекі па выкрыцьці і ліквідацыі ўзброеных антысавецкіх фармаваньняў. Дзейнасьць «легендаваных» атрадаў ня мела правакацыйнага характару.

**«НН»: Вы пішаце, што ня ўсе архіўныя дакумэнты КДБ выклікаюць у Вас давер. Ці можаце Вы прывесьці канкрэтныя прыклады? Ці верыце, што Кастусь Езавітаў памёр у турме НКДБ сваёй сьмерцю?**

**І.В.:** У манаграфіі я толькі падкрэсьліў, што, у параўнаньні з пратаколамі допытаў удзельнікаў падпольных структур, дакумэнтальна-рэчавыя дадаткі даюць больш аб’ектыўную інфармацыю дасьледнікам. А пра сьмерць К.Езавітава яшчэ ў сярэдзіне 90-х пісаў Уладзімер Міхнюк. І на падставе архіўных крыніцаў даводзіў, што той памёр ад сухотаў падчас сьледзтва. Я зь ім згодны.

**«НН»: Якую акцыю антысавецкага падпольля ў пасьляваеннай БССР Вы лічыце самай дзёрзкай?**

**І.В.:** Дзейнасьць антысавецкага падпольля трэба разглядаць у цэлым, а ня ў сувязі з асобнымі акцыямі. Учынкаў, падобных да тэракту ў Нью-Ёрку, тут не было. Але асобныя ўзброеныя выступы, тэракты, дывэрсіі, агітакцыі з боку антысавецкіх арганізацыяў і ўзброеных фармацый амаль дзесяць гадоў дэстабілізавалі жыцьцё заходніх абласьцей рэспублікі.

**«НН»: Ці рыхтаваліся ў паваеннай Беларусі тэракты супраць дзяржаўных і партыйных дзеячоў?**

**І.В.:** Я ня бачыў ніводнага архіўнага дакумэнту, які б сьведчыў пра гэта.

**«НН»: А выбух на партыйнай нарадзе ў Пінску ў 1945 г., пра які згадвае Ўладзімер Леанюк у сваім «Слоўніку Берасьцейшчыны»?**

**І.В.:** На жаль, мне не сустрэліся крыніцы з паведамленьнем пра гэты выпадак.

**«НН»: Ці будуць рэабілітаваныя і названыя вэтэранамі ўдзельнікі беларускага антысавецкага партызанскага і падпольнага руху — людзей, якія змагаліся за незалежнасьць краіны?**

**І.В.:** Крымінальныя справы ўсіх удзельнікаў антысавецкіх падпольных арганізацый, асуджаных савецкай уладай пасьля вайны, пераглядаліся. Некаторыя падпольшчыкі былі рэабілітаваныя, большасьці ж адмоўлена.

Людзі, якія змагаліся за незалежнасьць краіны, даўно маюць статус вэтэранаў. Я маю на ўвазе тых, хто змагаўся з фашызмам. Удзельнікі ж калябаранцкіх арганізацыяў, карных гітлераўскіх фармацыяў, якія зьнішчалі мірнае насельніцтва, сябры пасьляваенных антысавецкіх арганізацыяў, што былі асуджаныя і ў цяперашні час не рэабілітаваныя, такога статусу мець не павінны.

**«НН»: А як быць з удзельнікамі падпольных моладзевых арганізацыяў, якія ня бралі ўдзелу ў карных акцыях?**

**І.В.:** Гэта вельмі далікатнае пытаньне, вырашаць яго неабходна асобна ў кожным канкрэтным выпадку.

**«НН»: Пра што будзе Вашая наступная кніга?**

**І.В.:** Я працягваю вывучаць дзейнасьць антысавецкага падпольля падчас вайны. Акрамя таго, уваходжу ў склад аўтарскага калектыву, які рыхтуе падручнік па гісторыі органаў дзяржбясьпекі Беларусі.

**Гутарыў Сяргей Ёрш**

АД РЭДАКЦЫІ

## Патрэба дзяржаўніцкага падыходу

Нячаста супрацоўнікі КДБ даюць інтэрвію недзяржаўнай прэсе. Карыстаючыся нагодай, хацелася даведацца нешта новае пра беларускі паваенны Супраціў, пра лёсы яго ўдзельнікаў. Надзеі не апраўдаліся.

Не зьмянілася стаўленьне дзяржбясьпекі да гэтых людзей. Парадокс: той, хто змагаўся за незалежнасьць Беларусі супраць фашызму, прызнаны вэтэранам, а той, хто змагаўся за яе супраць бальшавізму, — ня мае такога шанцу. Нават удзельнікі моладзевага падпольля, якія не ваявалі супраць савецкай улады. Ларыса Геніюш і тая дагэтуль не рэабілітаваная.

КДБ па-ранейшаму шукае нацысцкіх злачынцаў. У студзені 2002 г. у Вашынгтоне паміж Пракуратурай Беларусі і Міністэрствам юстыцыі ЗША быў падпісаны важны мэмарандум аб каардынацыі высілкаў у гэтай справе. Але па-за ўвагай нашых спэцслужбаў застаецца пошук злачынцаў бальшавіцкіх — тых, у каго на руках таксама кроў нявінных людзей.

Дзесяць гадоў незалежнасьці не мінулі бясьсьледна для Камітэту. Хоць гэтага часу было замала, каб стацца паўнацэннай спэцслужбай незалежнай краіны, дзяржаўніцкі падыход раней ці пазьней пераможа.

**СЁ**

## 2 траўня пятніца

### ● БТ
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Заля чаканьня». Сэрыял.
9.15, 17.00 «Тайны Ніра Вулфа». Сэрыял (ЗША).
10.00 Сад мары.
10.25 «На скрыжаваньнях Эўропы».
10.50 Кухня КВК.
11.05, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 С.Станюта ў драме «Мама, я жывы!» («Беларусьфільм»).
15.15 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.45 Пяць цудаў.
15.55 «Вакол шпіёны». Анімацыйны сэрыял.
16.20 5х5.
19.10 Камэдыя «Быць закаханым».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Прэм’ера. Драма «Дом на Турэцкай вуліцы». (ЗША).

### ● СТВ
5.30 Музычны канал.
6.30 «Вар’яцкі сьвет» Дак. фільм.
7.30, 14.40 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
7.55 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
8.20 «Новы экшэнмэн». Мультсэрыял.
8.45, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.55, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
9.15 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.20, 18.15 «Менск і менчукі».
9.25, 22.50 «Тэхналёгія».
9.35 Кіно: камэдыя «Сямейка дурняў». ЗША, 1996.
11.10 «Гульнявы рэфлекс».
11.20, 20.35 «Аўтапанарама».
11.40 «Тэатральныя гісторыі».
11.55 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Дыялёг з усім сьветам». «Золата інкаў». Дак. фільм, 1-я частка.
13.50, 18.40 «На рагу ля Патрыярхавых». Тэлесэрыял.
15.00 «Клясыка гумару». М.Жванецкі.
16.00 «Сусьветныя розыгрышы».
16.45 Кіно: камэдыя «Папялушка ў ботах».
17.30 «Вовачка». Камэдыйны сэрыял.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.15 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
19.50 «СТВ-спорт».
20.00 «Рэактыўны бокс».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Я ажаніўся з забойцай зь сякерай». ЗША, 1993.
23.00 «Навіны СНД».
23.15 Кіно: трылер «Фанат». ЗША, 1996.

### ● Першы музычны канал
7.00 «Пад’ёмнік».
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

### ● АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.10 Нашы навіны.
8.05, 9.05 Камэдыя «Ва-банк».
9.55 Прыгодніцкі фільм «Тры мушкетэры». «Падвескі каралевы».
15.20 Выратавальнікі. Экстранны выклік.
15.45 «Каралі сьмеху». Марсэль Марсо.
16.15 Камэдыя «Зразумее толькі самотны». ЗША, 1991 г.
18.10 Камэдыя «Маскоўскія канікулы».
20.00 Час.
21.00 Сьвяточны канцэрт.
23.25 Трылер «Незаконнае ўварваньне».

### ● РТР
7.55 «Кнот». Выбранае.
8.30 Незвычайны канцэрт.
16.55 Камэдыя «Аксамітныя ручкі» (Італія). 1979 г.
19.00 Весткі.
19.25 Фільм «Сёстры». 2000 г.
21.05 «Сьвяточнае шоў Валянціна Юдашкіна».

### ● Культура
15.05 «У чацьвер і больш ніколі». Маст. фільм.
16.35 «Рамантыка рамансу».
17.15 «Дзень цудоўны». Мультфільм.
17.30 Рэтраспэктыва францускай кінакамэдыі. «Жыў-быў паліцэйскі». Маст. фільм (Францыя, 1972).
19.05 «Утрапёны Валеры Гергіеў». 50-годзьдзе маэстра.
20.00 «Маскоўскай апэрэце — 75 гадоў!». Юбілейны гала-канцэрт.
21.30 «Гордасьць і прадузятасьць». Тэлесэрыял.
23.15 Вечары з Аляксандрам Дольскім.
23.40 «Жыў-быў Казявін». Мультфільм для дарослых.

### ● НТВ
9.00. 10.00, 11.00, 15.00, 16.00 Сёньня.
9.05 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў: труп з заапарку».
10.05 «Кулінарны паядынак».
15.20 «Прафэсія — рэпарцёр».
15.45 Дэтэктыў «Шэрыя ваўкі».
18.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
18.30 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў: пастка для «Маманта».
19.35 Прэм’ера. Баявік «Сонечны ўдар». 2002 г.
21.30 Музычны фэстываль «Сан-Рэма-2003».

### ● Эўраспорт
9.30 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Таварыскія матчы. Паўтор.
10.30, 14.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Паўтор.
11.00 Футбол. УЭФА Клясык. Часопіс. Паўтор.
12.00 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Жывая трансьляцыя.
14.30 Тэніс WTA. Варшава. Жывая трансьляцыя. Чвэрцьфінал.
16.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004.
16.30 Вэляспорт. Тур Рамандыі. Трэці этап. Жывая трансьляцыя.
18.30 Тэніс АТР. Мюнхен. Жывая трансьляцыя. Чвэрцьфінал.
20.00 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд.
21.00 Формула. Аўстаспорт.
21.30 Супэргоначны ўік-энд. Часопіс.
22.30 Аўтагонкі.
23.00 Аўтанавіны. За рулём.
23.15 Кік-боксінг.
1.30 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.
2.00 Аўтанавіны. За рулём. Паўтор.

## 3 траўня субота

### ● БТ
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.25, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.40 «Заля чаканьня». Сэрыял.
9.15 «Тайны Ніра Вулфа». Сэрыял (ЗША).
10.05 Існасьць. Духоўная праграма.
10.30 Здароўе. Тэлечасопіс.
10.55 Падарожжа дылетанта. Гісторыя в.Беніца.
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.20 Плянэта АРТ.
12.45 Лірычная камэдыя «Добрай ночы!».
14.25 «Сьпявай, душа!». Фальклёрныя калектывы Менскага раёну.
15.15 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.40 Пяць цудаў.
15.55 Хакей. Чэмпіянат сьвету. Жывая трансьляцыя зь Фінляндыі.
19.30 Прыгодніцкі фільм «Нявесты шчасьліўца Люка» (Італія—ЗША).
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Баявік «Блакітны лёд» (ЗША).
1.00 Начны музычны этэр.

### ● СТВ
5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта». «Гарадзкое жыцьцё» з цыклу «Вынаходкі старажытных». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
9.00, 13.30, 16.30, 19.30, 22.10 «24 гадзіны».
9.20 «Тэма дня».
9.30, 22.20 «Тэхналёгія».
9.40 Кіно: камэдыя «Я ажаніўся з забойцай зь сякерай». ЗША, 1993.
11.25 «Рэактыўны бокс».
11.40 «Партрэт у інтэр’еры».
11.55 «Фільм, фільм, фільм».
12.10 «Віно каханьня». Тэленавэла.
13.00 «Дыялёг з усім сьветам». «Золата інкаў». Дак. фільм, 1-я частка.
13.50, 18.40 «На рагу ля Патрыярхавых». Тэлесэрыял.
14.40 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
15.00 «Клясыка гумару». Г.Хазанаў.
16.00 «Усё для цябе».
16.45 Кіно: камэдыя «Мы зрабілі гэта!».
18.05 «Тэатральныя гісторыі».
18.20 «Рамонт».
19.50 «СТВ-спорт».
20.05 «Фільм, фільм, фільм».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.35 Кіно: мэлядрама «Ну, ты і дурань».
22.30 «Навіны СНД».
22.45 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
23.15 Кіно: баявік «База-2». ЗША, 2000.

### ● Першы музычны канал
7.00 «Пад’ёмнік».
9.00 «120/80».
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 19.40, 22.30 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 Аўтапраграма.
23.00 МэгаМікс.

### ● АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.25 Нашы навіны.
8.05, 9.05 Камэдыя «Ва-банк ІІ, ці Ўдар у адказ».
9.45 Прыгодніцкі фільм «Тры мушкетэры». «Помста мілэдзі».
15.20 Тэорыя неймавернасьці. «Па той бок жыцьця».
15.45 «Падводны сьвет Андрэя Макарэвіча».
16.15 Камэдыя «Ўсё будзе добра».
18.10 Першамайскі «Ералаш».
18.30 Канцэрт «Народная марка» ў Крамлі».
20.00 Час.
21.00 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.05 «Фабрыка зорак-2».
23.40 Прэм’ера. Трылер «Джыпэрз Крыпэрз».

### ● РТР
7.40 Залаты ключ.
8.00 «Зборная Расеі». Спартыўная праграма.
8.25 Ранішняя пошта.
9.00 «Гарадок». Дайджэст.
9.30 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
17.00 Пакой сьмеху.
18.05 Гаворыць і паказвае Міхаіл Задорнаў.
19.00 Весткі.
19.25 Баявік «Захоп» (ЗША). 1992 г.
21.30 Прэмія «Оскар». Драма «Тайны Лос-Анджэласа» (ЗША). 1997 г.

### ● Культура
14.45 Ж.-Б.Мальер. «Амфітрыён». Прэм’ера тэлевэрсіі спэктаклю Дзяржаўнага акадэмічнага тэатру імя Вахтангава.
17.10 Магія кіно.
17.40 «У вашым доме».
18.20 Рэтраспэктыва францускай кінакамэдыі. «Туалет быў замкнёны знутры». Маст. фільм.
19.35 «Сфэры».
20.15 Вечары ў тэатры «Школа сучаснай п’есы».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.50 «Гордасьць і прадузятасьць». Тэлесэрыял.
23.30 Вечары з Аляксандрам Дольскім.

### ● НТВ
9.00, 10.00, 11.00, 15.00, 16.00 Сёньня.
9.05 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў: пастка для «Маманта».
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
15.15 Спорт. «Лято 6 з 49».
15.20 «Жаночы погляд».
15.50 Прэм’ера. Камэдыя «Вяртаньне мушкетэраў».
18.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
18.30 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў: зьнікненьне».
19.30 Дэтэктыў «Ідэальнае забойства» (ЗША).
21.40 Супэрбокс. «Шугар» Рэй Леанард супраць Вілфрэда Бэніцеса.
22.35 Эратычны фільм «Пажыральніца мужчын» (Італія).

### ● Эўраспорт
9.30 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. 1/8 фіналу. Паўтор.
11.30, 14.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Паўтор.
12.00 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Жывая трансьляцыя.
14.30 Тэніс WTA. Варшава. Жывая трансьляцыя. Паўфінал.
16.00 Вэляспорт. Тур Рамандыі. Чацьвёрты этап. Жывая трансьляцыя.
18.15 Тэніс АТР. Мюнхен. Паўфінал.
19.15 Тэніс WTA. Варшава.
20.15 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд.
21.00 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Жывая трансьляцыя.
23.30 Экстрэмальныя віды спорту.
0.45 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Солт-Лэйк-Сыты.
1.45 Бокс. Паўтор.

## 4 траўня нядзеля

### ● БТ
7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.35 Арсэнал.
9.05 Альхімія слова.
9.10 «Сузор’е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.40 Экран індыйскага кіно. «Уцёкі». 1-я сэрыя.
11.15 Сад мары.
11.45 Наша спадчына. Палац Тызэнгаўза ў Паставах.
12.20 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лято».
13.40 Сьвятыні Беларусі. «Сьвята-Мікольскі сабор у Магілёве».
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 «Касыяпэя». Сэрыял.
15.55 Хакей. Чэмпіянат сьвету. Жывая трансьляцыя зь Фінляндыі.
18.25 Кліп-абойма.
19.05 Маст. фільм «Паненка-сялянка».
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор’я.
22.15 Бокс. Баі наймацнейшых прафэсіяналаў сьвету. Оскар Дэла Хоя — Ёры. Бой Кампас. Трансьляцыя з ЗША.
23.10 Драма «Група «Дорз» (ЗША).

### ● СТВ
5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта». «Выратавальнікі». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «СТВ-спорт».
9.05 «Менск і менчукі».
9.15 «Партрэт у інтэр’еры».
9.30 «Аўтапанарама».
9.50 Кіно: маст. фільм «Старая крэпасьць».
11.00 Кіно: камэдыя «Агент у міні-спадніцы».
12.15 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
12.40 «Добры дзень, доктар!».
12.55 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
13.10 Кіно: маст. фільм «Новыя прыгоды няўлоўных». СССР, 1968.
14.40 «Клясыка гумару». С.Альтаў.
15.40 Кіно: вэстэрн «Чалавек з бульвара Капуцынаў».
17.20 «Залатая дзясятка Беларускай опэры».
17.50 «Вар’яцкі сьвет». Дак. фільм.
18.40 «168 гадзін».
19.25 «Пакуль гарыць сьвечка».
20.00 «Асабісты інтэрас».
20.30 «Гульнявы рэфлекс».
20.45 Кіно: камэдыя «Распусьніцы».
22.30 «Навіны СНД».
22.45 Кіно: трылер «Зацяты гулец». ЗША, 1999.
0.20 Канцэрт Джэніфэр Лопэс.

### ● Першы музычны канал
8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў». Культуралягічнае шоў.
13.00 «Пра Fashion». Модная праграма.
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

### АНТ
8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Ералаш.
8.30 Армейскі магазын.
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Юкі адкрывае Дыснэйлэнд».
10.15 Песьня году. Частка 1-я.
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.10 «Валадар смаку».
15.05 «Куміры».
15.30 Ток-шоў «Выбар».
16.10 Клюб падарожнікаў.
16.50 «Каралі сьмеху». Юры Нікулін.
17.45 Жывая прырода. «Прагулкі з дыназаўрамі», «Банды лемураў».
18.40 Прэм’ера. «КВК-2003». Прэм’ер-ліга. Першая гульня сэзону.
20.30 Контуры.
21.10 Супэрбаявік «Місія невыканальная». ЗША, 1996 г.
23.10 «Ралі «Беларусь-2003».
23.50 Прэм’ера. Баявік «Ураган».

### ● РТР
9.15 Ранішняя размова зь Дзьмітрыем Кісялёвым.
9.40 «Гарадок». Дайджэст.
10.10 Парад камэдый. Маст. фільм «Прыходзьце заўтра». 1963 г.
12.00 Сам сабе рэжысэр.
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Вакол сьвету.
14.15 Дыялёгі пра жывёл.
15.20 Аншляг.
16.20 Арнольд Шварцэнэгер у баевіку «Апошні кінагерой» (ЗША). 1993 г.
18.50 У «Гарадку».
19.25 Баявік «Захоп-2» (ЗША). 1995 г.
21.25 Сьвяточны канцэрт «Мікалай Баскаў і яго сябры».
0.15 Чэмпіянат сьвету па аўтагонках у клясе «Формула-1». Гран-пры Гішпаніі. Трансьляцыя з Барсэлёны.

### ● Культура
11.05 «Пецярбург-300». «Я хварэю за «Зэніт». Дак. фільм.
11.20 «Рыцары сьмеху». Улюбёныя кінагероі.
11.50 Нядоўгія гісторыі.
12.05 «Прыгоды Гекльбэры Фіна». Маст. фільм (ЗША, 1960). 3-я і 4-я сэрыі.
13.05 «Сымсала Грым. Прыгоды Брэмэнскіх музыкаў». Мультфільм.
13.30 «Дар дажджоў. Вялікія рэкі Афрыкі». Фільм 2-і. «Замбэзі. Магутная рака».
13.55 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.50 «Памяці маэстра». «Я.Сьвятланаў — перапыненая кульмінацыя».
15.30 Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру. Опэра П.Масканы «Сельскі гонар».
17.05 «Сьмех і гора ля Белага мора». Мультфільм.
18.05 Зорныя гады «Ленфільму».
18.45 Рэтраспэктыва францускай кінакамэдыі. «Ніякіх праблем». Маст. фільм.
20.25 «Гамаза».
20.50 «Болей чым каханьне».
21.30 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
22.00 «Культ кіно» з Кірылам Разлогавым. «Дзяўчаты». Маст. фільм.

### ● НТВ
9.00, 10.00, 11.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
9.05 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў: зьнікненьне».
10.05 «Расьліннае жыцьцё».
10.40 Вы будзеце сьмяяцца!
11.05 Увесь Жванецкі: пасьля ўчарашняга...
12.05 Мэлядрама «Амэрыканская дачка».
15.15 Гуляем у «Кено».
15.20 Экстрэмальны кантакт: падарожжа ў логава баракуды.
15.45 Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.05 «Нацыянальная бясьпека: інтэлект на вываз». Расьсьледаваньне НТВ.
18.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
18.30 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў: адсутнасьць доказаў».
19.50 Фільм тыдня. Камэдыя «Ландыш серабрысты».
21.40 Трылер «Акно ў спальні» (ЗША).
23.50 Сэрыял «Клан Сапрана» (ЗША).

### ● Эўраспорт
9.30 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Паўтор.
11.00 Формула-3000. Барсэлёна.
12.00, 18.00 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Жывая трансьляцыя.
14.00 Тэніс WTA. Варшава. Жывая трансьляцыя. Фінал.
15.30 Бокс. Паўтор.
16.00 Вэляспорт. Тур Рамандыі. Пяты этап. Жывая трансьляцыя.
19.15 Тэніс АТР. Мюнхен. Фінал.
20.30 Баявыя мастацтвы. Парыж Бэрсы.
22.00 Снукер. Чэмпіянат сьвету. Шэфілд. Жывая трансьляцыя.
0.15 Аўтагонкі Сэрыі Наскар. Фантана.
1.15 Матакрос. Чэмпіянат сьвету. Эўропа.

# Нашы на чэмпіянаце

Ад **26 красавіка** да **11 траўня** БТ будзе трансьляваць матчы Чэмпіянату сьвету па хакеі зь Фінляндыі. Беларускія гледачы пабачаць як мінімум шэсьць матчаў з удзелам зборнай Беларусі, два чвэрцьфіналы, паўфіналы і фінал. **26 красавіка** ў 15.55 пакажуць матч Беларусь—Канада, **27-га** ў 19.55 — Беларусь—Швэцыя, **29-га** ў 15.55 — Беларусь—Латвія. Далейшы расклад залежыць ад вынікаў тых гульняў. Весьці трансьляцыі будзе Ўладзімер Навіцкі.

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

# Крыніца «Аліварыі»

Аматары піва «Аліварыя» могуць адзначыць пачатак сапраўднай вясны ўдарнай працай у маёнтка графа Чапскага — заснавальніка згаданага бровару. У плянах арганізатараў працоўнай экскурсіі, што адбудзецца 12 красавіка, — упарадкаваньне тамтэйшага парку (аж да вартаньня яму ганаровага імя «італьянскі») ды расчыстка крыніцы. Апошняе мяне асабліва інтрыгуе: ці не выцякае яна раптам зь якога замаскаванага піўным магнатам склепу?



А. і Т. ЛЫЧАГІНЫ

Тых, каго пяцігадзінная (ад 11-й да 16-й) праца на сьвежым паветры ня зваліць з ног, чакае культурная праграма. У маёнтку цяпер месьціцца Інстытут аховы расьлінаў, музэй якога расчыніць перад вамі дзьверы. Многія яго экспанаты ня маюць адносінаў ні да аховы, ні да расьлінаў. Яны стасуюцца гісторыі маёнтку і... кінематаграфіі. Бо менавіта тут здымаўся першы беларускі мастацкі фільм «Лясная быль». Музэйны відэапраектар дапаможа пабачыць, як выглядалі гэтыя знаёмыя ўжо мясьціны ў далёкім 1926-м. Пасьля экскурсіі будзе канцэрт. Зайграюць маладыя барды, выступяць таксама блюзавы дуэт «4х8» і фольк-гурт «Гуда».

Маёнтак Чапскага знаходзіцца ў Прылуках (напрамак на Атоліна). Даехаць туды можна аўтобусам з Цэнтральнага аўтавакзалу (9.35), заплаціўшы 715 рублёў. Можна заплаціць удвая меней, але давядзецца перціся на Паўднёва-Заходнюю аўтастанцыю ды даўжэй ехаць. Але гэта варыянты на той выпадак, калі вы ня трапіце ў спэцыяльны аўтобус, які чакае ўсіх ахвотных у Трацкім прадмесьці (з боку Востраву Сьлёз) у 10.15. Аўтобус, як вядома, не гумовы, таму пажадана чым раней патэлефанаваць (8-0296) 63-29-51 (Ірына) і зарэзэрваваць месца. З сабою мець паесьці і пальчаткі.

**Ігар Няхведараў**

# «Тройца» — рэальны прэтэндэнт

**Пераможцы ў намінацыях «Рок-каранацыі» будуць вызначаныя паводле новай сыстэмы падліку галасоў. Інтрыга захаваецца літаральна да самага пачатку цырымоніі, ніхто гэтым разам ня здолее зьвінаваціць арганізатараў апытаньня ў махлярстве.**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«Тройца» рэальна прэтэндуе на галоўны прыз, хоць нельга сьпісваць з рахункаў і «Крамбамбулю»**

У аснове новай сыстэмы — факт выданьня на працягу мінулага году праграмы накладам ня менш як 300 асобнікаў для CD ці 500 — для MC. Магчыма, лічбу варта было б і падняць. Два дзясяткі журналістаў атрымалі анкеты, у якіх мусілі ў кожнай з намінацыяў вызначыць 3 ці 5 найлепшых, на іх думку, выканаўцаў. 15 красавіка адбыўся першы тур галасаваньня і былі вызначаны намінанты (іх «НН» назвала ў папярэднім нумары).

Пасьля ўдзельнікі апытаньня мусілі ў кожнай з намінацый вызначыць толькі аднаго пераможцу. Іх адказы ў заклееных капэртах перадалі ў аргкамітэт. Яго сябры ў прысутнасьці прадусэра «Каранацыі» Юр’я Цыбіна за тры гадзіны да пачатку цырымоніі і зробяць канчатковы падлік. Тры гадзіны патрэбныя, каб падрыхтаваць ганаровыя дыплёмы. Ня выключана, што ў некаторых з намінацыяў можа быць і не адзін пераможца.

Варажыць на малацэ — не найлепшы занятак. Аднак у намінацыі **«Выканаўца году»** інтрыга ёсьць. «NRM» ужо двойчы каранавалася галоўным прызам, а вось «Тройца» — ані разу. Гэты момант можа спрацаваць, хоць і «Крамбамбулю» як самастойны калектыў сьпісваць з рахунку ня варта.

На **«Альбом году»** прэтэндуюць чатыры калектывы. У «Чужых дзевак» «Палацу» шанцаў крыху менш, чым у іншых, хоць «Палац» таксама ніколі не адзначаўся галоўнай каронай.

А вось у намінацыі **«Прадусар году»** інтрыгі амаль няма: праект «Personal Depeche» і нечаканы, і арыгінальны, і ўвасоблены на нябачаным у Беларусі ўзроўні. А тое, што прадусары альбому «Легенды Вялікага Княства» А.Вячорка і В.Супрановіч трапілі ў намінанты, гаворыць ня толькі пра сапраўды ўдалы праект, але й адначасова пра тое, што інстытут прадусарства ў нас разьвіты надзвычай слаба. Прэтэндэнтаў у гэтай намінацыі было мала.

**«Песьня году»**: поўная непрадказальнасьць. Мне «Web-дызайн» ад «J-морсу» падаецца слабейшай пазыцыяй у параўнаньні з «Абсэнтам» «Крамбамбулі» й «Лямпай» «Імпэту». На **«Адкрыцьцё году»** прэтэндуюць гурты «J-морс», «Куклы» і «Чэхаў». Моцную канкурэнцыю склаў бы ім дуэт «Svet&Al», але першы іх альбом выйшаў накладам, меншым за патрэбны для намінаваньня на карону, а другі можна здабыць толькі ў аўтасалёне «Лібэрці мотарз» разам зь якім-небудзь новым «фордам». Сярод тройкі намінантаў перавагу аддаю «Куклам», хоць не ўхваляю некаторых лексычных зваротаў зь іх песень. Моцнай ненарматыўнасьцю вызначаецца і творчасьць прэтэндэнтаў у намінацыі **«Найлепшы рэгіянальны выканаўца»**, сярод якіх мне спадабалася група «Rasta». Аднак і тут вялікага выбару не было.

**«Кліп году»**: найбольш удала тут можа «стрэліць» «Калыханка» ад Сашы і Сірожы. Зьяўленьне гэтай намінацыі непасрэдна зьвязана з адкрыцьцём Першага музычнага каналу (пераможца ў «Падзеі году») і вяртаньнем кліпаў айчынных музыкаў на БТ.

Калі практыка пацьвердзіць слушнасьць прынятай сыстэмы вызначэньня пераможцаў, колькасьць удзельнікаў апытаньня налета павялічыцца, як і колькасьць намінацыяў. Адбудзецца тое ці не — вызначыць рынак. Інакш кажучы, наяўнасьць новых выданьняў, якіх хочацца пажадаць усім выканаўцам, а таксама тым людзям, якія нарэшце зразумеюць, што ўкладаць грошы ў беларускі музычны бізнэс — справа зусім не безнадзейная.

**Зьміцер Падбярэскі**

## Прыз ад «Нашай Нівы»

Падчас Рок-каранацыі будзе ўручаны і спэцыяльны прыз ад «Нашай Нівы». Каму — стане вядома на канцэрце.

# Дзе вы, «Рок-адкрыцьці»?

**Лёс пераможцаў у намінацыі «Адкрыцьцё году» аднолькавы: пасьля атрыманьня «рок-мэнзуркі» музыкі некуды зьнікаюць і на наступных каранацыях засьвечваюцца рэдка. З усіх адкрыцьцяў мінулых «Рок-каронаў» на буйных канцэртах сёньня пабачыш толькі двух-трох.**

Сярод тых двух-трох — «The Stokes», пераможца 1997 г. Ён зьмяніў стылістыку, перайшоўшы ад рытм-энд-блюзу да поп-року. Нядаўна музыкі зьнялі неблагі кліп на песьню «Между Минском и Римом», зьяўляліся на БТ, бралі ўдзел у канцэрце супраць вайны ў Іраку.

Адкрыцьцё-2001 «Безь білета» сёлета намінуюцца на «Кліп году» з маляваным відэаролікам «Стоп-бізнэс». Пасьля дэбютнага альбому «На неба», супольнай працы зь Фінбергам над песьняй «Мая краіна — Беларусь» адносіны ў гурце разладзіліся. Толькі нядаўна «Безь білета» стабілізаваліся ў новым складзе. Музыкі запісваюць па частках альбом, выступаюць па менскіх клюбах (нядаўна адыгралі ў «NC»), зьбіраюцца ўлетку на фэстываль «Маладэчна-2003», зрабілі ўласны сайт www.bezbileta.com.

Адкрыцьцём мінулай каранацыі быў гурт «Імпэт». Вакалістка Дана абяцае, што пры канцы лета каманда выдасьць нарэшце свой дэбютны дыск. У 2002 г. «Імпэту» далі ўзнагароду ў сукупнасьці: за перамогу на «Басовішчы» і за песьню «Зусім няпроста», якая паўгоду круцілася на FM-станцыях. Пасьля прызнаньня «Імпэт» крыху прапаў: нешматлікія клюбныя выступы, адсутнасьць новага гіту калібру «Зусім няпроста», праблемы з складам (гітарыст Максім Ліпскі зьехаў на няпэўны час у Ізраіль).

У 2000 г. музычныя журналісты адзначылі адразу двух дэбютантаў: «Exist» і «ТТ-34». Як паведаміў дырэктар «ТТ-34» Сяргей Полаўцаў, гурт цяпер працуе над сынглам з чатырох песьняў, а пад восень абяцае зрабіць альбом. Канцэртуе пакуль у родным Гомелі, але, маючы на руках запіс, пляную распачаць турнэ па маскоўскіх клюбах. «Гэта ня значыць, што мы арыентуемся толькі на Маскву, пэўных вэктараў мы для сябе не вызначаем», — кажа ён. Свой стыль музыкі акрэсьліваюць як «сучасная цяжкая музыка, народжаная асяродзьдзем, у якім мы жывём». То бок тым самым Гомелем.

Такой музыкі, як у «Exist», тут на той час ніхто ня граў. Усе найноўшыя модныя плыні, ад noise да гардкору, сынтэзаваліся ў творчасьці Юрася (Хобіта) Купрашова і Андрэя (Эндру) Восіпчыка. А вось зь іншымі музыкамі была праблема. Якія толькі бубначы зь імі ні йгралі! Быў нават Зьміцер Харытановіч, былы ўдзельнік «Hasta La Fillsta» і «Zet», які цяпер «бубніць» у «Лепрыконсах». «Exist» перамог на «Басовішчы», выдаў сынгл «Памыліўся», але пастаянныя праблемы з складам выклікалі распад гурту. «Exist» аднаўляўся на час перадвыбарных канцэртаў, але ўжо бяз Хобіта, з поп-сьпеваком Харлі ў якасьці вакаліста. Сам Хобіт зьехаў у Ірляндыю — зарабіць грошай. Як кажа Эндру, на радзіме «U2» Юрася апанавалі новыя музычныя ідэі, ён абяцае хутка вярнуцца і адрадзіць праект.

Нядоўга праіснавала й «Hasta La Fillsta» — адно з каранацыйных адкрыцьцяў. Вакалістка выехала ў Бэльгію, пра бубнача мы ўжо згадвалі, а гітарыст і басіст граюць у «Крамбамбулі» з Вольскім.

Цікавы лёс у гурту «Happy Face», пераможцы-99. Ён быў успрыняты на «ўра» пры канцы 90-х — у час асаблівай папулярнасьці гранджу, калі нават Вольскі выкарыстоўваў алюзіі з Курта Кабэйна. Маладачанскія хлопцы выдалі ангельскамоўны альбом «Grunge?!», адзначыліся шэрагам скандальных канцэртаў, прыдумалі самі вызначэньне свайму стылю — постграндж. Пасьля ўшанаваньня «рок-каронкай» стылю хлопцы не зьмянілі — як у музыцы, так і ў паводзінах. Асабліва гэта выявілася на адным з «Басовішчаў»: вядучы Аляксандар Памідораў нават не хацеў выпускаць гурт на сцэну. Пасьля было нудысцкае купаньне ў месцы актыўнага адпачынку жыхароў Гарадку, страта гітары, катаньне на польскім «мацыклеце з каляскай» і іншыя чыста кабэйнаўскія прыколы. Пасьля мода на грандж паступова сышла. А «Happy Face» застаўся. Сёньня іх можна пачуць на нешматлюдных клюбных вечарынах памяці Курта.

Яшчэ адзін ангельскамоўны праект, які быў ляўрэатам, — «Thank you Jesus» («Дзякуй богу», калі перакласьці адвольна). Каранямі гэтая каманда сягае да іншага адкрыцьця — году 1995-га. Тады журы адзначыла дэбют ангельскамоўнага гурту «Why Not». Амаль адразу пасьля цырымоніі яго лідэр Андрэй Краўчанка зьехаў у Лёндан, астатнія ж далучыліся да гурту «Буржуазія», выціснуўшы ранейшых музыкаў. Тыя «выціснутыя» і ўтварылі «Thank you Jesus», што граў узорны мэйнстрым-рок. Хлопцы зьдзейснілі пасьпяховую вылазку ў Нямеччыну, у выніку зьявіўся ці ня самы якасна запісаны альбом айчыннага року «Between No Distance». Гурт так і застаўся «праектам аднаго альбому», хоць колькі разоў музыкі яшчэ зьбіраліся разам. Пасьля бубнач зьехаў у Амэрыку, гітарыст сышоў у «Песьняры». Адзіны альбом стаўся рарытэтам, песьні «Thank you Jesus» можна скачаць хіба на сайце www.mp3.com.

«Адкрыцьцё году» — вялікае выпрабаваньне для маладой каманды. Тыя самыя «медныя трубы», якія могуць загубіць. Гэта не апошні, а толькі першы крок да прызнаньня, за якім мусяць быць наступныя. А той, хто спыняецца на гэтай прыступцы, — гіне.

**Сяргей Будкін**

Людка Сільнова

# Вера беларуса



IREX-PROMEDIA

Як усе людзі на сьвеце, беларусы вераць у звышнатуральныя сілы. Вераць у Бога на небе, анёлаў, сьвятых, у існаваньне чорта ў апраметнай. Гэтая вера дасталася нам у спадчыну ад продкаў. Вось што можна перадаваць пасталелым дзецям, не губляючы, — ідэі, веру, звычкі! (Вера — ня грошы, якіх падчас перадачы робіцца менш, і гэта ў найлепшым выпадку! Дый само слова «грошы» падазрона падобнае на «грэх»... Але — парадокс: «багаты» прыпадабняецца да «Бога», і, як паказвае жыцьцё, ня толькі паводле гучаньня.)

У нядзельным радыёэтэры густым мёдам ліецца голас пробашча, які чытае «Ойча наш»: «...І адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым...» Я пяку бліны для сям'і — язычніцкія (гэта значыла калісьці — «народныя»), круглыя і залатыя, як сонца. І думаю пра сутнасьць граху ў сучасным сьвеце і хранічную адсутнасьць грошай. (У мяне. У сьвеце іх — поўна...) Можа, я зашмат адпускаю вінаватым? Асабліва «вінаватым нашым»?

Зь іншага боку, слова «грэх» у беларускай мове асацыятыўна можна лёгка зьвязаць з «гарою». Грэх — гэта парушэньне запаведзяў Божых, дадзеных нам калісьці Богам на высокай Гары вуснамі Сына Яго Ісуса Хрыста. Выходзіць, грэх — гэта грукнуцца ўніз з тае Гары высокае маральнасьці. (І от каб дзеці заўсёды гэтак, як Ісус, былі з бацькамі — адно!.. Тады час і рух, пэўна, прыпыніліся б і надышла б Вечнасьць. Ёсьць пра што падумаць сучасным татам і матулям. І настаўнікам...)

Прыходзіць аднойчы да Бога чорт і кажа:

— Забяры ад мяне зь пекла аднаго маладзёна!

— Не магу. Вышэйшы суд вырашыў накіраваць яго ў пекла. Значыць, яму там і быць!.. А што здарылася?

— Ды ён у мяне ўсіх чарцей разагнаў, патэльні перавярнуў, смалу павыліваў. А пасьля яшчэ спытаўся, дзе тут «другі ўзровень»...

Моладзь прыпадае да «іконак» на экранах манітораў, але наведвае і Божы храм. Там іконы не зьмяняюцца так часта, яны маюць вялікія памеры. Але не заўсёды: ікона Жыровіцкай Божае Маці, напрыклад, маленькая, як яечка, падфарбаванае барвяным дымам часу. У дні паломніцтва я прыпадала да яе ў малітве... Сэмінарысты — як чорныя гракі на белым сьнезе — мне нагадвалі нейкі містычны скрынсэйвэр.

Кампутар, алтар, «альма-матар», нарэшце, тэатар — што ў іх супольнага? Ня толькі тое дынамічнае, экспрэсіўнае, старажытнае «-тар» на канцы, але й элемэнтарны сэнс гэтых словаў: «зьбіраньне разам», разам у адным полі — інфармацыйным, рэлігійным, эстэтычным... Так што вернік або сьвятар за маніторам глядзіцца гарманічна і праведна. Ня грэшна і ня сьмешна зусім. (Праўда, гледзячы чым яны там у той віртуальнай рэальнасьці займаюцца...)

Калі чалавек маніць (самавольна мяняе рэальнасьць) ці абдурвае каго, у нас кажуць: «Бог не цяля — відзіць круцяля». У беларускай мове, як і ў многіх эўрапейскіх, словы, што азначаюць Бога і быка, пачынаюцца аднолькава: «Бог» і «бык», «Тэо» і «тур», «Гот» і ўсялякія мадыфікацыі «гавяды». І чаму карыда, на якой прыгожа прылюдна забіваюць быка, ёсьць для гішпанцаў аднačасова і рэлігіяй, і тэатрам, і школай каханьня, і спортам?

Малітва — гэта зварот чалавека да Бога з ухваленьнем Яго і просьбаю, у непахіснай веры і пакоры, з чыстым сумленьнем. Часта яна патрабуе сакральнай мовы і пэўнага рытуалу. У дзяцінстве на лета бацькі адвозілі мяне ў вёску Селівонаўку да татавай маці — бабы Соф'і. Я заўважыла тады, што баба Соф'я скончае дзень зусім ня так, як мая маці, — таямнічым шаптаньнем. Нават пасярод дня ў яе былі моманты нейкага раптоўнага адчужэньня і нашэптваньня незразумелых словаў. Асабліва мяне, дзяўчынку, уражвала тое, што бабуля зь некім відавочна гаворыць (заве і пра нешта просіць...), а той — ніколі не адгукаецца і не паказваецца.

Яшчэ тады я заўважыла, што позіркам сваім яна кранаецца ў тыя хвіліны карцінкі, захутанай, як дзіця, у доўгі вышываны ручнік з карункамі, — іконы. Аднойчы я паставіла крэсла, залезла ў сандалях на яго рыпучы падсрачнік і пацягнулася позіркам у кут, дзе вісела выява маці з хлопчыкам на каленях у атачэньні маленькіх фігурак у жоўта-ружова-блакітных плашчах. Рамка была абклееная серабрыстай паперай — не на шакалядках! А хлопчык на каленях у маці, здавалася, прывітальна махаў мне рукой...

Тыя выявы падаліся мне жывымі істотамі, але здранцьвелымі, зачараванымі. Яны напружана глядзелі на мяне — і ўсё ніяк не маглі аджыць! Нібыта ў чарадзейнай казцы!.. Таму бабуля гэтак своеасаблівa, казачна і зьвярталася, бывала, да таго кута: «Царыца Нябесная!..» — і сама размаўляла зь імі на іхнай мове — напружанага здранцьвеньня. (У нас у дзяцінстве была гульня: «Мора хвалюецца — раз! Мора хвалюецца — два! Мора хвалюецца — тры! На месцы, фігура, замры!» — і мы заміралі да салодкага болю ў цягліцах...)

Баба сядзела вечарамі на разабранай пасьцелі з распушчанымі, як у малой дзяўчынкі, сваімі тонкімі косамі і малілася. Валасы, прывучаныя за дзень, па-нетутэйшаму кучаравіліся. Якраз як у мяне, малой, што сядзела побач... Мы абедзьве былі маленькімі дзецьмі перад Госпадам, перад Багародзіцай.

Таму мне пасьля заўсягды здавалася, што маліцца — гэта рабіцца маленькім (тым больш што гэта падкрэсьлівалася рытуальным прыпаданьнем на калені ці хоць бы адно). «...Божа, ачысьці грахі мае і зьмілуйся нада мною…»

Толькі нашмат пазьней, калі й я сама стала маці — зямнога сына, з кароткім мужчынскім імем, што нагадвае пра Героя і Гару, — у любімай адзін час малітве да Багародзіцы адчувала я ня зьвыклую «маласьць», а жаночую годнасьць і нібы тайнае салодкае сваяцтва з абранаю. «Багародзіца-Дзева, радуйся, поўная ласкі Марыя, Госпад з Табою, блаславёная ты між жанчынаў і блаславёны плод улоньня Твайго Ісус...» (Можа, гэта фэміністычныя ідэі ўва мне тады такім пунсовым цьветам цьвілі?)

Малілася татава маці як бы па-расейску. У праваслаўным абрадзе. І імя ў яе было бізантыйскае, дзьвюхтысячагадўняе — Соф'я, Сафія, Мудрасьць... І ў яе была супернiца — у асобе мамінай маці, другой маёй бабулі, каталічкі. З старадаўнім каралеўскім імем — Ядзьвіга. Жыла яна на другім канцы сьвету — у Заходняй Беларусі, у вёсцы зь цёмна-зялёнай назваю Паляны. Частку доўгага школьнага лета я бавіла там. (О, гэтыя «ровар», «шведар» і «футар», і «Матка Боска!» на ўвесь гарод!) Дзьве бабулі змагаліся за маю душу і цела, таемна ахрысьціўшы і молячыся за мяне кожная паводле свайго абраду і ў сваім храме. І на сваёй мове... Дык вось, мова бабы Ядзьвігі — польская — была мне яшчэ больш незразумелая.

У левым кутку на падваконьні, ля вазона, баба палянская трымала маленькую кніжачку з малітвамі, з салодкай «кандытарскай» назвай — «кантычка», у шакалядным скураным пераплёце і з ружовымі берагамі старонак. А побач ляжаў ружанец, як нізка гарошынаў чорнага перцу, з крыжыкам на канцы. (Ня ведаю, чаму першыя дотыкі да рэлігіі былі ў мяне насычаныя такімі смакавымі асацыяцыямі? Можа, таму што яны былі ў дзяцінстве, якое спазнае сьвет шмат у чым праз язык? А пазьней ужо — праз мову і Слова.) На ноч, перад вячэрняй малітваю, бабуля апускала ў шклянку з вадой свае штучныя зубкі, рабілася шапялявай і бяззубай, як я. Пела словы тонкім, нібы ў малой дзяўчынкі, галаском. І па-добраму ўсьміхалася ў канцы, абдымаючы сваю Людвісю...

Мяркую, адсюль у мяне «дзьве душы», як у героя аповесьці Максіма Гарэцкага. Ведаю і іншых беларусаў, у каго гэтак. А добра гэта ці дрэнна, сьмешна ці страшна — ня ведаю. Але гэта — ёсьць.

У нашай нацыянальнай сям'і праваслаўная — гэта суровая «бацькава вера», каталіцкая — прыгожая «матчына вера», а пратэстанцкая — вера бунтарных іхніх дзяцей-падлеткаў, што паводле права свайго веку шукаюць «сваю» ісьціну. Унія — найстарэйшая, лагодная вера-дачка.

Жывуць у Беларусі і ўніяты, і пратэстанты, і стараверы, і юдэі, і мусульмане, і будысты, і крышнаіты, і прадстаўнікі шматлікіх новых веравызнаньняў. Усё як у іншых людзей. Па-свойму зьвяртаюцца яны да Бога, і Ён разумее іх...

Ёсьць сярод нас многа нявернікаў і атэістаў (спажытыя дулі эпохі Асьветніцтва і вальтэр'янства — куды там яблыкам Евы! — даюць аб сабе знаць). Атэізм мне падаецца балючымі драпінамі, сарванай скурай на каленках малога дзіцяці. Вось яно ўляцела ў гасьцёўню, поўную прыгожа апранутых людзей, зь мячом — круглай зямной куляй — у руках і з брудам уперамешку з чырвонай крывёй ніжэй шорцікаў: «Ма-ма!..»

Каталікі ў беларускай мове называюць свой храм словам мужчынскага роду — Касьцёл, а праваслаўныя — жаночага: Царква. Апошняя мае да таго ж кранальны эпітэт — «Нявеста Хрыстова». У будынку Царквы — шырокія, найчасьцей залатыя макаўкі, белыя або сьветлыя сьцены. Будынак жа Касьцёлу здаля ўражвае сваёй вэртыкальнай імклівасьцю, цёмнымі або барвянымі сьценамі-кальчугай... Часта храмы мянялі свой канфэсійны «пол», па некалькі разоў за стагодзьдзі свайго існаваньня. Драматычна ці будзённа (гледзячы хто браў на балянс, калі патрабаваўся рамонт). І ня раз бывала, што беларусы хадзілі па-ранейшаму ў храм туды, куды бліжэй. Гэтак жа выяўлялі яны свой натуральны прагматызм ці талеранцыю, па-браўшыся шлюбам ці пераехаўшы жыць у іншае месца: «каб з усімі людзямі разам».

Люстэрка і Залюстроўе! Эх, шкада толькі, што існуе дзіўнаваты разрыў у часе паміж сьвяткаваньнем Нараджэньня Хрыстовага ці Пасхі ў каталікоў і праваслаўных. Адна жанчына казала: «Вот бедны Хрыстос мучыцца! Толькі зь мёртвых устаў, зноў лезь на той крыж, каб паўтарыць усё спачатку!.. Двайны боль яму, і ўсё праз нас, грэшных».

Гэтая дваістасьць, казачная сымэтрыя, «мігценьне» розуму — і ў фэномэне назваў хрысьціянскіх сьвятаў у Беларусі, калі хрысьціянская назва накладаецца каляндарна на былую язычніцкую, змагаецца і ніяк ня можа перамагчы яе ў цёмнай, як доўгая ноч багача, сьвядомасьці на-

# Маладая «Саксаманія»

Ад гітары да саксафона — адзін крок. Менавіта так вырашыў Юры Рашэтнікаў, які штогод ладзіць фэстываль «Грыфаманія», калі ўзяўся за арганізацыю «Саксаманіі». Тое ж, што заля ПК МТЗ падчас сьвята саксафаністаў была не зусім поўная, можна патлумачыць так: публіка да фэсту яшчэ не прывыкла, а самі саксафаністы вядомыя ў краіне горш, чым тыя ж гітарысты.

Атрымаўся выразна моладзевы фэстываль. Ад саксафаністаў старэйшага пакаленьня быў адзін Анатоль Радзюкоў, удзельнік яшчэ легендарнай «Тонікі», якая акампаніявала Віктару Вуячычу і праз гэта пастаянна выяжджала за мяжу. Выконвае Радзюкоў вечназялёныя джазавыя стандарты, публіку бярэ ня так бліскучай тэхнікай, як добрым разуменьнем таго, што ёсьць клясыкай.

Маладыя граюць зусім іначай. У апошнія гады зьявілася столькі таленавітых саксафаністаў, што толькі дзіву даешся! Вось два аднагодкі-Андрэі: Барыла і Церабеж. Першы, стала заняты ў ансамблі «Рэнэсанс», нібыта і схіляецца да традыцыі, аднак у сольнай праграме выдае яўную замілаванасьць музыкай ня толькі любімага Майкла Брэкера, але і куды больш маладых, вострых амэрыканцаў. Церабеж любіць эфэкты, галаваломныя пасажы, ягоная альтовая стыхія — тэмп на мяжы магчымага, у якім ён трымаецца ўпэўнена.

Самы сталы сярод маладых — Антон Машкала, які сёньня разрываецца паміж схільным да традыцыі ансамблем «Дыліжанс» і эўрапейскім ф'южн групы «Новыя джазэры». Ягоны тэнар больш разважлівы і лірычны, грунтоўны, але і ён не нясе аніякага занудзтва, рэстаранщчыны.

Асобна пра тое, як паказаліся пеставанцы менскай музвучэльні, дзеці тых, хто засноўваў у Менску джазклюб у канцы 70-х. Андрэю Малахаву 21 год. Энэргіі ў аднаго — на квартэт. Ірае дзе толькі магчыма. Таму мае трывалае адчуваньне сцэны і амбіцыі юнага лідэра. Мае чым перакнаць: і тэхніка, і добры гук, і спраўныя калегі-аднадумцы. Самае істотнае — ён выконвае цалкам сучасную музыку! Вядома, ня грэбуючы і абавязковай праграмай.

Павал Аракелян — яшчэ маладзейшы. Фанат! Як сказаў Анатоль Радзюкоў, ягоны настаўнік, такіх маладых і адначасова «прасунутых» саксафаністаў у Беларусі яшчэ не было. Настаўнік вельмі прыдзірліва слухаў вучня і першы паказаў на нейкія нелады з гукам. Пазьней, калі Павал мусіў акампаніяваць Радзюкову, ягоны саксафон такі зламаўся. Але з высокімі ацэнкамі я згодны, бо Аракелян да ўсяго яшчэ і не абы-які актор, і «матор» усяго бэнду.

Выдатны атрымаўся канцэрт! Шкада, што не было Антона Боева і ягонай фанкавай групы «Atava», майстра Віталя Ямуцеева, абяцанага Паўла Бяляўскага, якому, як казалі, Міхаіл Фінберг знайшоў тэрміновы занятак. І дарма Юры Рашэтнікаў абышоў увагай нашых саксафаністак. Будзьце пэўныя: там ня толькі на што паглядзець ёсьць, але і што паслухаць.

**Зьміцер Падбярэскі**



**Анатоль Радзюкоў на прэзэнтацыі альбому «Мадэра хард блюз»**

роду. Раства счапілася з Калядамі, Пасха — зь Вялікаднем, Ян — з Купальлем... І нібыта судзьдзі — Дзяды. (Дзяды, Жыжа, Зюзя, Ляля, Цёця — імёны даўнейшых багоў, падобныя на першае дзіцячае лепятаньне.)

Як жа пры ўсім гэтым беларусы Богу моляцца?.. Па-рознаму.

Існуе такая студэнцкая показка. Анёл-пасланьнік дакладае Богу:

— Да пачатку экзамэнаў у студэнтаў застаўся месяц. Агратэхнічны ўнівэрсытэт вучыць, пэдагагічны вучыць, эканамічны вучыць, радыётэхнічны п'е.

За тыдзень да пачатку сэсіі Бог зноў пасылае анёла на зямлю. Той вяртаецца і кажа:

— Зноў тое самае: Агратэхнічны вучыць, пэдагагічны вучыць, а радыётэхнічны п'е.

І вось пачалася сэсія. Бог пасылае анёла ў трэці раз:

— Паглядзі , як там студэнты...

Той паглядзеў і дакладае:

— Агратэхнічны здае, пэдагагічны здае...

— А радыётэхнічны?

— Богу моляцца!

— От ім Мы й дапаможам!

На «б» пачынаюцца найзначнейшыя для беларусаў словы: Бог, Бацькаўшчына, бацька, бульба і бібліятэка (Нацыянальная... ну, тая, новая, макет якой гэтак нагадвае абабраную белую бульбіну на драўляным донцы)... З «б» пападзе — найсмачнейшыя беларускія стравы і напоі: бабка-дранка, бліны, боб пражаны, боршч і бражка... Прозьвішчы сёньняшніх пісьменьнікаў-куміраў — таксама на «б»: Барадулін, Брыль, Быкаў, Багдановіч, Бічэль… Ну, і сама назва нашай балтыйскай краіны — Беларусь.

У Беларусі Бог — ж ы в е...

БІБЛІЯТЭКА

# Як позна–позна. І як рана–рана

**Літаратура ад старажытнасьці да пачатку эпохі рамантызму: Папулярныя нарысы / Укладальнік Лявон Баршчэўскі. — Менск: Сэр-Віт, 2003. Наклад 3000 ас.**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Чалавек з кніжкаю ў руках на вокладцы мае задуменна-засмучаны выраз твару. Калі гэтая постаць — у ёй адчуваецца выразны ўплыў іканаграфіі Скарыны — увасабляе чытача кнігі, то трэба прызнаць, што мастак годна выканаў задачу рэцэнзэнта. Бо акрамя захапленьня кніжка выклікае шэраг няпростых пытаньняў.

Як кітаіст кітаісту, шчыра прызнаюся спадару Баршчэўскаму: задаволены тым, што сярэднявечную кітайскую паэзію рэпрэзэнтуюць Лі Бо і Ду Фу. Але як іраніст іраністу, запярэчу: нельга выдзіраць зь неабсяжнае пэрсідзкае паэзіі аднаго Амара Хаяма. Гэта ўсё адно, што рэпрэзэнтаваць беларускую літаратуру паэзіяй Барыса Кіта (калі такая ёсьць), або расейскую — вершамі Ламаносава, а італьянскую — санэтамі аднаго Мікеланджэла. Хаям мог бы йсьці разам зь Фірдаўсі й Рудакі, як больш вядомы эўрапейскаму чытачу, але ніяк не аднаасобна.

Але дзе ўзяць тэксты? Пытаньне гэтае ёсьць адначасна адказам. Нарысы адлюстроўваюць ня столькі ўяўленьне адукаванага беларуса пра сусьветную літаратуру, колькі стан ейнага абеларушчваньня. Яны падпарадкаваныя практычным мэтам выкладаньня сусьветнай літаратуры ў школе па-беларуску. У гэтай ролі кніжцы цаны няма. Празрыстая мова, кароткія, запамінальныя фармулёўкі, патрыятычны патас і захопленасьць прадметам не пакінуць чытача абыякавым. Разгляд літаратурнага жыцьця Беларусі ў эўрапейскім кантэксьце ствараe годную і прывабную сыстэму адліку для маладога беларуса, якому адрасаваная гэтая кніга, дапамагае адчуць прыналежнасьць да высокіх каштоўнасьцяў эўрапейскае цывілізацыі.

Але нельга не заўважыць, як слаба падмацаванае імкненьне аўтара тэкстамі. Каб не самаадданая перакладчыцкая дзейнасьць самога сп. Баршчэўскага, стварэньне кнігі было б немагчымым. І калі для настаўніка і школьніка яна будзе каштоўным дапаможнікам і сябрам, дык для перакладчыкаў нарысы Баршчэўскага гучаць як жорсткі дакор.

Мала, мала, да сораму мала. Настолькі мала, што асабістыя прэфэрэнцыі нешматлікіх перакладчыкаў накладаюць, нягледзячы на ўсе высілкі ўкладальніка, незьнішчальны адбітак на склад тэкстаў. Адныя творцы ўзносяцца высока з простае прычыны наяўнасьці перакладаў, іншыя — несправядліва застаюцца ў цені (той жа Фірдаўсі або Чосэр, пра якога я не знайшоў нават згадкі).

Нешматлікасьць перакладаў ставіць укладальніка перад цяжкім выбарам. Рубаі Хаяма выдадзеныя пабеларуску толькі ў выкананьні Рыгора Барадуліна. І, пры ўсёй павазе да майстра, іх нельга назваць дасканалымі. Гэта хутчэй насьледаваньні, выкарыстаньне тэмаў і вобразаў. Гэткія самыя сумневы выклікае знаёмства самога сп.Баршчэўскага з старажытнаірляндзкай (урывак з «Нараджэньня Кухуліна») або Янкі Сіпакова — з кітайскай. Хутчэй за ўсё, выкарыстоўваўся іншамоўны падрадкоўнік, і ня бачу падставаў не пазначаць гэтай акалічнасьці — хай бы стымулявала моладзь да вывучэньня моваў.

Цяжка, думаю, далося ўкладальніку рашэньне не даваць цытатаў з «Боскай камэдыі», нягледзячы на наяўнасьць поўнага перакладу У.Скарынкіна. Вядома, знаёмства зь перасычаным русізмамі тэкстам выклікае іншы раз жаданьне зьмяніць назву на «Бажэственная камедыя», але бязь некалькіх тэрцынаў артыкул пра Дантэ выглядае пуставатым.

Добра, што зьявілася такая кніга нарысаў па сусьветнай літаратуры. Але позна нам ганарыцца **такой** кнігай, бо яна зафіксавала ледзьве не эмбрыянальны стан нацыянальнага перакладу. Зарана яна выйшла, каб стацца падставай для гонару, бо нямашака пакуль дастатковай колькасьці якасных тэкстаў. Кожная вартая такой назвы Кніга дорыць ня толькі слодыч зьдзейсьненьня, але й горыч нязьдзейсьненага.

**Даніла Жукоўскі**

# Хвароба трацiны Эўропы



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Нават любімы хатні гадаванец можа быць носьбітам алергенаў.**

### Сёе-тое пра алергію

Яе любімыя месяцы — травень і чэрвень. Ахвяраў яна выбірае вельмі старанна. Калі вы дбаеце пра чысьціню, рэгулярна робіце прышчэпкі й нашпігоўваеце свой арганізм антыбіётыкамі, зьяўляецеся адзіным дзіцем у сваіх бацькоў, жывяце ў вялікім горадзе, пазьбягаеце жывёльных тлушчаў і любіце экзатычныя стравы, сьцеражыцеся: можаце стаць любімай ахвярай алергіі — хваробы, ад якой пакутуе трэцяя частка эўрапейцаў.

Яе часта блытаюць зь віруснай ці бактэрыяльнай інфэкцыяй верхніх дыхальных шляхоў. Яе характэрныя рысы — кашаль, інтэнсіўны насмарк, запаленьне горла і пры ўсім гэтым — адсутнасьць тэмпэратуры і болю.

Алергія — сапраўдная паморка нашае эпохі. Яе першапрычына — забруджаньне навакольнага асяродзьдзя. Яе наступствы — рэзкі рост захворваньня на астму. У Менску сёньня на тыя ці іншыя віды алергіі пакутуе амаль чвэрць немаўлятаў.

Палова тэрапэўтаў, да якіх вы першы раз зьвернецеся з алергіяй, не пазнае яе й выпіша антыбіётыкі ды асьпірын — звычайны паратунак ад інфэкцыяў. Другая палова прапануе на спробу супрацьалергійныя лекі, якія не дапамогуць у выпадку інфэкцыі (а калі ваш агульны стан відавочна палепшыцца — вораг выяўленьне). Калі ж спроба ня дасьць ніякага эфэкту, трэба кіравацца да алерголяга. Праўда, добрых спэцыялістаў у гэтай галіне ў Беларусі пакуль няшмат. Таму рыхтуйцеся вытрымаць тры-чатыры скурныя тэсты на выяўленьне пэўных алергенаў, а таксама на вызначэньне іх узроўню ў крыві. Дасьведчанаму алерголягу хопіць і двух-трох такіх тэстаў.

### Ворага трэба ведаць

Галоўныя алергены — тыя, што трапляюць у арганізм праз нос. Звычайна гэта расьлінны пылок, пераважна ліставых дрэваў (бяроза, ляшчына, вольха, таполя, букі, дубы і г.д.), пасьля хваёвых (пераважна звычайны ядловец) і, нарэшце, травы ды збожжа.

Алергенамі зьяўляюцца цьвіль, эпідэрма хатніх жывёлаў (сабака, котка, хамяк), хатні пыл, часьцінкі аўтамабільных шынаў. Усе разам гэтыя алергены «адказваюць» за 90% выпадкаў.

З харчовых алергіяў, якія атакуюць пераважна дзяцей і выклікаюцца ў асноўным малаком, яйкамі ды пшаніцай, амаль усе мы вырастаем. Толькі два алергены, здараецца, не перарастаюцца і мучаць нас усё жыцьцё — арэхі й рыба.

Адзін чалавек з трохсот алергічна рэагуе на атруту асьвянак, пчолаў, чмялёў. Скончыцца гэта можа небясьпечным для жыцьця анафіляктычным шокам. І, нарэшце, невялічкі працэнт хворых пакутуе на пасьлялекавую рэакцыю. Асабліва тут небясьпечныя антыбіётыкі.

### Ці можна пазбавіцца ад алергіі

«Найлягчэйшы» выпадак — калі алергенамі зьяўляюцца хатнія жывёлы. Калі аддаць у добрыя рукі сабаку ці котку, рэгулярна рабіць у хаце вільготную прыборку, празь месяцдругі алергія зьнікае. Адносна лёгка можна пазбыцца стрававай алергіі — дастакова ня есьці «падазроных» страваў ці замяніць іх іншымі (напрыклад, хлеб з жыта ці пшаніцы — соевым).

Найбольш праблемаў ствараюць алергены, якія стала нам спадарожнічаюць: пылок расьлінаў, хатні пыл ды цьвіль. Тут патрэбнае фармакалягічнае лячэньне ці сэрыя прышчэпак. Як і проціінфэкцыйныя, прышчэпкі супраць алергіі ўтрымліваюць нізкую канцэнтрацыю хваробатворнага фактару (напрыклад, экстракт бярозы ці ляшчыны). Прышчэпку трэба рабіць на працягу трох месяцаў раз на тыдзень наконадні пэрыяду апыленьня і паўтараць тры гады запар. Пасьля пра алергію можна забыцца на сем-восем гадоў.

# Сьмех дый годзе

**Чаму мы інстынктыўна цягнемся да вясёлых людзей, а панурых пазьбягаем? У чым таемная сіла сьмеху?**

Калі пры канцы 70-х Лі Бэрк з групай калегаў пачынаў дасьледаваць сьмех, ён жадаў знайсьці адказы на гэтыя і шмат якія іншыя пытаньні. Цяпер прафэсар Бэрк — віцэ-дырэктар Цэнтру нэўраімуналёгіі пры амэрыканскім унівэрсытэце Лома Лінда. Але, як і чвэрць стагодзьдзя таму, займаецца пераважна сьмехам і яго ўплывам на наш арганізм. За гэты час ён напісаў дзясяткі працаў і зладзіў мноства экспэрымэнтаў. Цяпер некалькі тысяч навукоўцаў займаюцца такімі дасьледаваньнямі. І ўсе яны пакуль прыйшлі да адзінага выніку. Бэрк фармулюе яго наступным чынам: «Людзі з пачуцьцём гумару, людзі, што шукаюць «лепшыя бакі жыцьця», звычайна здаравейшыя і больш задаволеныя жыцьцём».

### Ня будзь рымлянінам

Што адбываецца ў нашым арганізьме, калі мы сьмяёмся? Шмат прыемных рэчаў. Умова адна — сьмех павінен быць сапраўдным і спантанным. Зрэшты, іншы сьмех сабе ўявіць складана. Сапраўдны сьмех — гэта падкрэсьліваюць усе знаўцы прадмету — немагчыма стрымаць, як і сапраўдны плач. Паспрабуйце захаваць важны выраз твару, калі чуеце ці бачыце нешта сапраўды сьмешнае. Можна, вядома, навучыцца блякаваць спантанныя рэакцыі, як гэта рабілі старадаўнія рымляне, якія лічылі, што гучныя выбухі сьмеху ўласьцівыя толькі людзям неадукаваным і вясёлы рогат немагчымы ў кампаніі людзей з шляхетнымі манерамі. Але навошта?

Бэрк згадвае, як 20 гадоў таму ён зладзіў экспэрымэнт, у якім узялі ўдзел ягоныя калегі: «Мы глядзелі камэдыі і адначасова назіралі, як працуюць нашыя сэрцы і зьмяняецца склад гармонаў у нашай крыві. Нам было сапраўды весела. За наступныя гады мы дасьледавалі гэткім чынам сотні людзей. Вынікі проста зьдзіўлялі».

### Сьмейся, калі табе блага

Сьмех — як вынікае з дасьледаваньняў Бэрка і іншых навукоўцаў — выклікае самыя пазытыўныя рэакцыі: масажуе сардэчную мышцу, паляпшае вэнтыляцыю лёгкіх. Найбольш інтрыгоўнае адкрыцьцё — шчыры сьмех узмацняе імунную сыстэму. Вясёлыя людзі лепш супрацьстаяць інфэкцыям. Ад сьмеху ў нашай крыві зьяўляецца больш лімфацытаў, якія бароняць наш арганізм ад вірусу. Сьмеючыся, мы можам больш эфэктыўна супрацьстаяць болю (узрастае прадукаваньне эндарфіну — натуральнага проціболевага сродку) і стрэсам (зьніжаецца ўзровень стрэсавых гармонаў, якія падвышаюць ціск крыві). Чым радзей сьмяешся, тым хутчэй трапіш да кардыёляга.

Сьмейся, калі хворы ці калі табе проста блага. Магчыма, многіх такая прапанова шакуе. Але сьмех сапраўды дапамагае ў складаных сытуацыях. І гэта падкрэсьліваюць усе дасьледчыкі. Хутка дактары будуць прапісваць сваім пацыентам больш сьмеху. Уявіце сабе рэцэпт, у якім побач зь лекамі будзе выпісаная добрая порцыя сьмеху штодзённа, напрыклад прагляд камэдыяў.

### На гэта трэба двое

Як лёгка сказаць: «Мы сьмяёмся». Але з чаго? Ды з усяго. Сьмяяцца можна, нават калі трапляеш у непрыемную і вельмі прыкрую сытуацыю. Усё залежыць ад пачуцьця гумару. Толькі ў 20% выпадкаў людзі сьмяюцца з таго, што прачыталі, пачулі ці ўбачылі нешта гумарыстычнае. Значна часьцей сьмех зьяўляецца, проста калі бачыш чалавека, які весела і шчыра рагоча. Гэта, дарэчы, тлумачыць, чаму мы так любім вясёлых людзей. Дзякуючы ім, самі часьцей усьміхаемся, а ўрэшце робімся трошкі здаравейшыя.

І яшчэ адзін вынік дасьледаваньняў, на які варта зьвярнуць увагу. Аднойчы навукоўцы прапанавалі студэнтам, каб тыя цягам некалькіх тыдняў запісвалі моманты, калі шчыра сьмяяліся. Выявілася, што мала хто сьмяяўся, калі быў адзін, хоць усе яны лічылі сябе людзьмі вясёлымі. Таму сьмейцеся больш і майце на ўвазе: каб атрымаць прыстойную порцыю гэтых навамодных лекаў, сьмяяцца трэба мінімум удваіх.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Хутка дактары будуць прапісваць сваім пацыентам больш сьмеху. Шчыры сьмех узмацняе імунную сыстэму, таму вясёлыя людзі лепш супрацьстаяць інфэкцыям.**

МХ; «Gazeta Wyborcza»




Сакавік—красавік

ARCHE

У кнігарнях і шапіках, а таксама ў партфэлях незалежных кніганошаў зьявіўся красавіцкі нумар часопісу «ARCHE». Тэма нумару — «Туманнасьці беларускай гісторыі». Яна распачынаецца апытаньнем «З чаго, на Вашую думку, пачалася (пачынаецца) гісторыя Беларусі й чым яна скончыцца?», на якое адказваюць а.А.Надсан, І.Сурвілла, Л.Вольскі, А.Фядута, Ю.Дракахруст ды інш. У падборцы матэрыялаў таксама стэнаграма «круглага стала» па праблемах беларускай гістарыяграфіі, што адбыўся ў сакавіку ў ПЭН-цэнтры, артыкулы Джэймса Фліна, Генадзя Прыбыткі, Яраслава Грыцака, а таксама рэцэнзія Андрэя Катлярчука на этапную для ўсходнеэўрапейскіх дасьледаваньняў кнігу Цімаці Снайдэра «Адбудова нацый. Польшча, Украіна, Літва, Беларусь», што выйшла ў Ельскім унівэрсытэце. Перагукаюцца з тэмай і ірляндзкія нататкі маладога палітоляга Аляксандра Батуры, і дэканструкцыя афіцыёзнай гісторыі Беларускага сымфанічнага аркестру, зробленая Юліяй Андрэевай, і чарговая архіўная публікацыя Анатоля Сідарэвіча. Валеры Булгакаў аналізуе новую ідэалёгію лукашэнкаўцаў. Уладзіслаў Гарбацкі зноў піша аб праблемах сэксуальных меншасьцяў у Беларусі (на гэты раз ягоны артыкул здольны выклікаць бурную дыскусію). Друкуюцца шматлікія водгукі і рэцэнзіі (на «Рухнаму», «Хадановіцкі нумар» «ARCHE», замежныя выданьні пра Беларусь і навуковыя працы з розных галінаў ведаў). Сапраўдным упрыгожаньнем нумару сталі эцюды Евы Вежнавец «Гаючая нянавісьць» ды вершы Рыгора Барадуліна, Людкі Сільновай, Анатоля Трафімчыка, Андруся Храпавіцкага.

## Тэда ЛІ

* * *

Пляскатай вялікай рукой
Нехта грукнуў па ртутных слупкох
І паклікаў у госьці вясну
На карнізах паліць сьвечкі з пахам трускалак.
І россып бурштыну ў паветры
Ужо не нагадвае сьнег,
А сьмяецца ў нашых вачох
І на жоўтых насох чаравікаў.
Сакавік перашэптамі вершы
Чытае на мове намёкаў,
Кранае цябе за асадку,
І ты пішаш у сшытку: вясна.
Пра сябе, пра мяне і пра нас,
І пляскатыя рукі на целах тэрмомэтраў.
Над табой распускаецца сонца
І зьбягаюцца ў кола сабакі,
І сьпяваюць вясновыя гімны,
Падымаючы ўгору хвасты.
За сабою прыносіць вясну
Твой настаўнік спадар Тычына,
Апрануты ў колер пяску,
І кашулю вясновага неба,
І ў гальштуку колеру мора.
Таго мора, якое калісьці
Нас з табой заліло з галавой...



УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

**Барні**. «Вядома, што Польшча ды маскалі / Нашу краіну спрадвеку дзяўблі», — пішаце Вы. Сьвятая рацыя, але на паэзію гэта пакуль ня цягне.

**Зуйку Г., Алесю ПостКамуністычнаму.** Тое, што ў вас атрымалася, хутчэй рыфмаваная агітка. Паспрабуйце напісаць пра тое, што хвалюе Вас асабіста.

**Рыгору С**. Верш пра спакушэньне Эвы някепска змайстраваны, але нічога не дадае да тысячаў і тысячаў Вашых папярэднікаў, што пісалі пра гэта.

**Сержуку**. Ваш лірычны герой у мілосным вершы кажа: «Але інтэнцыі ня маю да сустрэчы». Хай будзе прасьцейшым — і гераіня сама да яго пацягнецца.

**Ярыне Б**. Ваш верш мог бы стацца добраю эпіграмай, але выйшаў задоўгім і хутчэй злым, чым дасьціпным. Скарацеце яго радкоў да васьмі, скончыўшы на «героях», «што, як быццам, у дошку нашыя, / і задумы ў іх геніяльныя: / ставяць ракам і дзевак крашаных, / і ідэі нацыянальныя». Рэшта — лішняе.

Вялікі дзякуй усім, хто даслаў свае вершы ў «Нашу Ніву»! Многія зь іх яшчэ будуць надрукаваныя. Лістуйце й дасылайце нам творы. З павагаю,

**Андрэй Хадановіч**

## Іна АМЕЛЬЧАНКА

### 25-га Сакавіка

Сонца пяшчотай
цешыцца,
дзень табе нараджаючы,
ціхую песьню раніцы,
неба вясновага блюз.
Соннай тваёй усьмешкаю
цэлы Сусьвет усьміхаецца,
шэпча, бязьмежна
кахаючы:
Белая, Белая Русь...

Ў час, калі душы тояцца,
ты нас мацуеш вераю:
нашы памкненьні добрыя
ўсё ж не пайшлі на друз.
Мы — каласы жытнёвыя,
ласкай тваёй сагрэтыя,
сьветлая наша, шчодрая,
Белая, Белая Русь!

Шчасьця поўныя
прыгаршчы
мы паднясем да губ тваіх.
Птушкай-пяюшкай,
казкаю,
радасьцю нашай будзь!
Нас не зламаць, ня
вынішчыць,
не апусьціць ў забытае,
любая наша, ясная,
Белая, Белая Русь!

## Андрэй ВАЛОШКА

* * *

Цябе параўноўвалі з грушай,
Шыпшынай.
Нехта скажа прыгожа, што
ты —
Вішня ці зёлка якая,
Птушка ці зьвер.
Беларусь дарагая мая.
Утульны куточак нэндзы.

## Валярына КУСТАВА

* * *

Здранцьвеюць вусны —
буду вачамі
гаварыць.
Выкажу вочы —
буду сэрцам
вітацца.
Разьвітаю сэрца —
буду душою
біцца.
Разаб'ю душу —
буду...
Буду.



УЛАДЗІМЕР СКАМАРОШЧАНКА

## Тумаш МАРЦЫБЫЛІН

* * *

Са шчытом, зь
перамогаю
Памёр ваяр,
Не дайшоўшы да дому.
Дай, Божа, моцы...

* * *

Вада. Кола.
Млын. Жорны.
Зерне. Мука. Хлеб.

## Юрась НЕРАТОК

### Біном

Ты ішоў па жыцьці
незалежна і горда.
Ты імкнуўся ісьці
не дугою, а хордай.

Ты людзём раздаваў
цеплыню і спагаду
і заўжды даравáў
абыякавасьць, здраду.

Ты выходзіў у сьвет,
быццам гоншчык на трасу.
Быў любы твой праект
толькі справаю часу.

... А цяпер ты — біном:
раздваеньне натуры.
Побач пляшка зь віном,
ты бязьдзейны і хмуры.

Ты чытаеш свае
замінулыя творы
і заграз, бы ў смале, —
ні здаровы, ні хворы.

Ненажэрна грызе
пацучыная скруха,
і сьлязою паўзе
па акне тваім муха.

## Віялета ПАЧКОЎСКАЯ

* * *

Ноч, прымружыўшы адно
вока,
падглядае праз шыбу
сны.

* * *

Аркушы-двайняты:
адзін — голуб,
другі — вайсковы
самалёт.

* * *

Ноч.
Сьвятлафор на
скрыжаваньні
ня ведае,
у які кабак падацца.

## Юрась ПЕТУХОЎ

* * *

Халодны ранак
дакрануўся да твару.
Ты ўсьміхнулася.

* * *

Летняе ночы
мне ў бабулінай хаце
зіма сьнілася.

* * *

Аўтобус ідзе.
Угару ўздымаецца
пыл і самота.

## Аксана СПРЫНЧАН

### Зь нізкі «Тваё акно»

Уладзімеру Бярбераву

* * *

Чакаю цемры,
каб паглядзець
у люстра твайго акна.
Думаю — яно меней
маніць.
Падманваю сябе.

* * *

Матылёк на тваім акне
выцірае пыл,
выцірае сваё жыцьцё.

* * *

Анёл
у троіцы вокнаў
тваёй кватэры.

## Юзэфа ЧАНТАРЫЦКАЯ

* * *

Старшыня наш Вайнілка
Вельмі добра працуе.
Ён для працы калгаснай
Сябе не шкадуе.

Ён рана ўстае,
Позна спаць лажыцца,
Праз калгасныя справы
Ён ня можа жаніцца.

Але, можа, Бог дасьць,
Дзяўчыну знойдзе сабе
І тады пад вянец
У касьцёл прывядзе.

Мы ўсе будзем рады
Ягонай жаніцьбе,
І ў ягоным жыцьці
Няхай добра ўсё выйдзе.

Каб Вайнілку не мяшала
Раённае брацтва
Куды здаць малако,
Каму прадаць мяса.

Ён жа сам гаспадар
У сваім калгасе.
Ён жа хоча, каб усё
Было ў запасе.

Тады б калгаснікі ўсе
Зусім не сумавалі,
Бо заробленыя грошы
Хутка б атрымалі.

Няхай добра ўсё будзе
Спадару Вайнілку,
Ён ніколі ня зробіць
У працы памылку.

Будслаў

## Дрэнны жарт

На жаль, у Рэспубліканскім конкурсе «Я маю твор…», матэрыялы якога друкаваліся ў «НН» №15, стыхійна зьявілася новая намінацыя — «за найлепшы плягіят». Алена Шмык з Заберазі (Івейшчына) ды Руслан Салавянчык з Случчыны «працытавалі» творы беларускіх пісьменьнікаў Віктара Гардзея й Леаніда Дайнекі, падпісаўшы іх сваімі імёнамі. Пільныя чытачы «НН» засьпелі дамарослых постмадэрністаў на гарачым. Арганізатары конкурсу, што таксама не плянавалі намінацыі «за плягіят», выключылі гэтых аматараў «цытаваньня» з складу фіналістаў і прыносяць спадарам Гардзею й Дайнеку свае шчырыя выбачэньні.

**Андрэй Хадановіч**

## Усевалад СЬЦЕБУРАКА

* * *

Мае вершы, як сьмерці, баяцца паперы,
А здараецца часам, што нават мяне.
Быццам пляма́ў крывавых на белай сьцяне,
Мае вершы, як сьмерці, баяцца паперы.
Быццам келіха тога, што не абміне,
Бы сумневаў і выпрабаваньняў у веры.
Мае вершы, як сьмерці, баяцца паперы,
А здараецца часам, што нават мяне...

## Апанас ЦЫХУН

### Сее восень янтар

Памяці паэта Міхася Васілька

Васільком узышоў ты на золку ў расе
На бацькоўскай той ніўцы пясчанай.
І падняўся зь зямлі, каб у майскай красе
Для Радзімы стаць краскай жаданай.

Цябе сонца пякло, злосна дзьмулі вятры,
Засыхаў ад журбы на прадвесьнях,
І пяскі засыпалі ў час змрочнай пары —
Ты ж братоў на змаганьне зваў песьняй...

Паляцела ў прастор твая песьня, як звон!
Але песьня табой не дапета...
Сьмерць раптоўна ўзяла цябе ў вечны палон —
І ня стала трыбуна-паэта.

Ты ляжыш, наш пясьняр. Сее восень янтар.
І магіла вянкамі ўся ўкрыта.
Журавы пакідаюць наш родны абшар —
Не збудзіць ім цябе сваім крыкам.

Але імя тваё будзе жыць у вякох,
Там, дзе Нёман нясе свае воды.
Дзе Бароўня твая патанае ў садох,
Дзе над Котрай рунеюць усходы.

## Віталь СТАХІЕВІЧ

### Начны паром

Людцы нясьпешна варушаць глуздамі,
Човен бурклíва імкне.
Вочы бляндынак міргаюць аддана,
Штосьці чытае японская дама,
Мора люструе ў акне.

Ціха засмоктвае цётка-чужына,
Мовай штурхае у сон.
Бераг застрашвае змрокам магільным,
Бразгае іржою старое цапільна,
Сыніцца Абрам Ватасон.

Нарвэгія, верасень 2002

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Лекцыі пра польскі досьвед

У Менску адбудуцца чарговыя публічныя лекцыі польскіх экспэртаў з цыклу «Шляхі да дэмакратыі і свабоднага рынку». Першую, «Зьмены ў польскай сыстэме права ў сувязі з інтэграцыяй у Эўразьвяз», можна будзе пачуць **24 красавіка** ў памяшканьні Польскага Інстытуту (вул.Валадарскага, 6). Пачатак а 17-й. Лектар — спн.Яна Шыхоўска, дырэктарка Дэпартамэнту эўрапейскага права Ўпраўленьня Камітэту па справах эўраінтэграцыі Польшчы. Другую лекцыю — «Структурныя зьмены ў польскай эканоміцы на шляху да ЭЗ» — прачытае прафэсар Ежы Асятыньскі, былы міністар фінансаў Польшчы. Адбудзецца гэта **25 красавіка** ў Беларускім інстытуце правазнаўства (вул. Караля, 3, аўд.20). Пачатак а 18.30.

### Выстава Марачкіна

У Беларускім ліцэі імя Якуба Коласа (вул. Кірава, 21) адчыняецца выстава жывапісу Аляксея Марачкіна, на якой славуты мастак прадстаўляе свае новыя працы. Вэрнісаж адбудзецца **25 красавіка** а 16-й.

### Талака ў князя Міхала

Упарадкаваньне сядзібы Агінскіх ў Залесьсі (Смургонскі раён), пра якую «НН» паведамляла ў мінулым нумары, перанесеная на пятніцу, **25 красавіка**. Гэта ня проста плянавае веснавое прыбіраньне — яно мае яшчэ й сымбалічны сэнс. Так у Залесьсі сьвяткуюць чарговую гадавіну вяртаньня на радзіму Міхала Клеафаса Агінскага, які прыехаў туды пры канцы красавіка 1802 году, каб настала пасяліцца ў радавым маёнтку. Агінскі ехаў, відаць, фаэтонам. Нам жа найзручней будзе выправіцца ў Залесьсе чыгункай: электрычкай ад Менску да Маладэчна і далей гудагайскім дызэлем. Пачатак талакі а 12-й, але калі хто й раней прыедзе — занятак знойдзецца. Вопратка — сьвяточна-працоўная; каб не галадаць, прыхапіце ссабойкі.

# Сустрэча з Бартосікам



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**29 красавіка ў 18.30 ва Ўправе БНФ (вул.Варвашэні,8) адбудзецца творчая сустрэча з празаікам і бардам Зьмітром Бартосікам. Уваход вольны.**

### Вечарына памяці Ромэра

**24 красавіка** ў Дольнай залі Чырвонага касьцёлу адбудзецца вечарына памяці грамадзяніна чатырох краінаў Альфрэда Ромэра. Гэты вядомы мастак, немец па нацыянальнасьці, нарадзіўся на Віленшчыне, стварыў лепшыя свае карціны, жывучы на Мядзельшчыне, а публіцыстыку — краёвую па духу — пісаў па-польску. Дадатковая інфармацыя пра імпрэзу па т.: (8-0296) 63-29-51 (Ірына), 257-93-11 (Алесь).

**СМ**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Быкаў В. Доўгая дарога дадому:** Успаміны. — Менск: ГА БТ «Кніга», 2002. — 544 с.

Васіль Быкаў разважае пра перажытае, пра ўласны лёс, пра мінулае й будучыню Беларусі. Аўтар папярэджвае, што кніга — «твор вельмі інтымны, суб’ектыўны, аднабаковы. Думаецца, у тым ягоная сіла, але адначасна й слабасьць». Большасьць асобаў, згаданых ва ўспамінах, выступае пад сапраўднымі імёнамі. У кнізе няма біяграфічных камэнтароў, тэкст не прайшоў карэктуры. Наклад выданьня — 2000 ас.

**Вярцінскі А. Жанчына. Мужчына. Каханьне:** Лірыка. — Менск: Чатыры чвэрці, 2003. — 64 с.

У зборнічак увайшлі вершы, напісаныя ў розныя гады й прысьвечаныя самай кранальнай тэме — каханьню. Прадмову да кнігі падрыхтаваў Л.Дранько-Майсюк. У «Кнігарні пісьменьніка» выданьне каштуе 5000 руб. Наклад — 500 ас.

**Дамініка:** Беларускі часопіс для маладых сем’яў. — 2003. — № 2.




Другі нумар «Дамінікі» працягвае ствараць жыцьцёвую прастору для беларускамоўнай сям’і. Артыкулы, зьмешчаныя ў часопісе, закранаюць самыя разнастайныя аспэкты сямейнага побыту: псыхалягічныя й полавыя ўзаемадачыненьні, хатнюю гаспадарку, здароўе, адпачынак. Велікодным сьвятам і традыцыям прысьвечаны матэрыял «Ужо недалечка чырвона яечка». Адказ на пытаньне, ці складаць шлюбную дамову, апісаньне даступных кожнаму сродкаў ад стрэсу, тэст «Які зь цябе бацька?», цікавосткі, показкі, конкурсы, агляд беларускамоўных выданьняў для дзяцей «Мама, пачытай» ды іншая карысная й лёгка, цікава выкладзеная інфармацыя — на старонках «Дамінікі».

**Зенькович Н. Чья Белоруссия? Границы. Споры. Обиды.** — Москва, 2002. — 416 с.: ил. — (Государственные тайны)

Аўтар кнігі — беларус з паходжаньня, а сёньня — жыхар Расеі, прадстаўнік папулярызаванай «літаратуры факту», дасьледчык тайных спружынаў савецкай ды найноўшай расейскай гісторыі. Лёгка жанглюючы зьвесткамі, атрыманымі зь дзяржаўных ды прыватных архіваў, гістарычных крыніцаў (сярод названых у сьпісе аўтараў — Ф.Турук, А.Луцкевіч, Я.Карскі ды інш.), матэрыялаў СМІ, М.Зяньковіч стварае сваю інтэрпрэтацыю беларускае гісторыі ды сучаснасьці. Цытаты выдатна сьведчаць пра стыль кнігі: «Чаму Расея адштурхоўвае Беларусь? Хто перашкаджае іх новаму аб’яднаньню?», «Ці моцныя ў Беларусі антырасейскія настроі?», «Як у Маскве «пяклі» і куды потым «упякалі» кіраўнікоў Беларусі?» Выданьне тэндэнцыйнае, але багатае на фактычны матэрыял. Многія дакумэнты, датычныя палітычнай гісторыі савецкай Беларусі, публікуюцца тут упершыню. Наклад — 5000 ас. Цана ў шапіку ў будынку Акадэміі Навук — 10000 рублёў.

**Трансформация экономики: проблемы и решения:** Сб. статей, докладов, законопроектов / Пад рэд. В.М.Шлындзікава. — Менск, 2002. — 558 с.

Зборнік — спроба абгрунтавана падаць праграму па перадоленьні крызысу беларускай эканомікі. Кніга складаецца з двух разьдзелаў — «Пра адаптацыю прамысловасьці да рынкавых умоваў» і «Пра разьвіцьцё малога прадпрымальніцтва». Сярод аўтараў — В.Шлындзікаў, С.Багданкевіч, М.Трыфанаў, В.Фадзееў і інш. Наклад — 500 ас.

**Тацяна Вабішчэвіч**

## КОНКУРС «НН»

**Ч**ароўны **А**геньчык, **Ж**урботная **З**ьнічка, **Б**оскім **С**ьвяці **Ф**аервэркам!

**Зоя Жук, Горадня**

**Ч**мель **А**цішвае **Ж**ывот — **З**ьніклі **Б**убен, **С**мык, **Ф**агот.
**Ч**уць **П**аднялася **Ж**ывінка-**З**аранка — **Б**оўтае **С**мык **Ф**іранку.

**N, Слуцак**

**Ч**амадан **А**дкрыў **Ж**абрак: **З**ьнік, **Б**адай, **С**тарэнькі **Ф**рак.
**Ф**іфа **С**ела **Б**аляваць — **З**ельц **Ж**аваць, **П**упок **Ч**асаць.

**Аляксей Бацюкоў, Магілёў**

**Ч**алавек **П**асыпаў/**А**дсыпаў **Ж**вір — **З**начыць, **Б**удзе **С**паць **Ф**акір.
**Ч**эсік, **П**эўна, **Ж**ававы **З**ух, **Б**о **С**фастрыгаваў **Ф**артух.
**Ч**ую **П**эндзэлевы **Ж**альбы — **З**усім **Б**лага **С**охнуць **Ф**арбы.

**Раман Станкевіч, Менск**

Наступны нумар «НН» выйдзе **13 траўня**, у аўторак. У Менску ў продажы — з абеду панядзелка. Хрыстос уваскрос!

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Марыі Т. з Залесься.** Вашы высновы слушныя, а крытыка неапраўданая. «Сваіх» палітыкаў адрозьніце ад «несваіх» паводле спраў, а не паводле слоў. Хітры палітык зможа і непрыцеляў выкарыстаць, а дурны і з сваімі звадзіцца. Калі палітык беларускі па натуры, гэта цьвёрдая зарука ягонага дзяржаўніцтва. Ня майце гістарычных ілюзій: не Селязьнёў з Чарнамырдзіным усё вырашылі ў 1996 г. Яны падтрымалі б любога мацнейшага — і падтрымалі таго, каго падтрымала большасьць беларусаў, хто меў больш рашучасьці і хто апанаваў СМІ.

**Віталю С. зь Менску.** Артыкул пра антынямецкія настроі простых амэрыканцаў безумоўна прыцягне ўвагу немца. Беларускаму ж чытачу цікавей дазнацца пра антыбеларускія ці беларусафільскія настроі дзе-кольвек.

**Генадзю Л. зь Менску.** Найперш ад нас залежыць, будзе «Белакаменная» ігнараваць незалежнасьць Беларусі ці не.

**Зьмітру П. з Кастрыцы.** У навінах, што трапляюць на старонку «З усёй краіны», галоўнае — тое, што ўбачана Вашымі вачыма і перадумана Вамі. Вычытанае ў газэтах — не навіна.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Спадарства Кананові, Кавалеўская, Эзерын, Саган, Кузьняцоў (Віцебск), а таксама спадар Валеры, які пражываў па вул.Каржанеўскага, 10/2! Просьба зьвярнуцца наконт Вашых замоваў на каардынаты: а/с 150, 220107, Менск. Пэйдж.: 211-85-85, аб.25402. E-mail: belvidea@hotmail.com

**КАЦЯНЯТЫ**

**Прэзэнт.** Кацяняткі белыя ў шэрыя плямы. Т.: 252-70-89

**ВІТАНЬНІ**

**Хрыстос уваскрос!** Віншую праваслаўных зь Велікодным сьвятам! Сьвятар Аляксандар

**Сонейка!** Віншую цябе з нашым сьвятам! Твой зьвержык

**Каханую зорачку Марыську Працько** віншую з Днём народзінаў. Зычу радасьці, усьмешак, зьдзяйсьненьня ўсіх мар. Генадзь

**Прывітаньне Спадару Сержу** ад былых вучняў (11 «Г», 1998). Віншуем з 35-годзьдзем! Сьвятлана Кандабарава

**Віншуем Зянона Пазьняка** з Днём нараджэньня й Велікоднымі сьвятамі! Сябры раённай арганізацыі КХП-БНФ г.Віцебску

**Віншую Петруся Копчыка**, кіраўніка гурту беларускай культуры «Зорка Вэнэра» з Украіны, з Днём народзінаў. Янка Талпыга

**КАНТАКТЫ**

**ZBSB.org** — сайт згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына»

**OLSA.by.ru** — навіны, рок-каранацыя, новыя фотагалерэі, гасьцёўня

**КВАТЭРА**

**Віцебск на Менск**, Маскву, Пецярбург, 1-пакаёвую кватэру, прыватызаваную, палепшанай пляніроўкі, мяняю на жытло. А/с 21, 210021, Віцебск

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**Кнігі—поштай,** а таксама беларускія CD & Video, замаўляйце каталёг. Тэл. (8-0296) 43-57-33, а/с 333, 220050 Менск, exlibris@tut.by, глядзіце таксама ў Internet: http://exlibris.cjb.net

**Кнігі—поштай.** Замаўляйце каталёг: праз пошту — п/с 333, 220050, Менск, праз e-mail: exlibris@tut.by, праз Internet: http://exlibris.cjb.net, праз тэлефон: (8-0296) 43-57-33

**Кнігі—поштай — новае:** відэа па-беларуску «Глядыятар»

**Кнігі—поштай — новае:** новая кніга У.Арлова і З.Герасімовіча «Краіна Беларусь» , «Краса і сіла. Анталёгія беларускай паэзіі XX стагодзьдзя» укл. М.Скоблы і яшчэ 4 навінкі

**Кнігі—поштай — новае:** мультфільмы Ўолта Дыснэя па-беларуску (14 найменьняў), новыя кнігі (6 найменьняў). Замаўляйце каталёг: праз пошту — п/с 333, 220050 Менск, празь e-mail: exlibris@tut.by, праз Internet: http://exlibris.cjb.net, праз тэлефон: (8-0296) 43-57-33

**Вельмі танна** прадаю цудоўныя кнігі з хатняй бібліятэкі на розныя тэмы. Укладзіце капэрту, вышлю каталёг. А/с 21, 210021, Віцебск

**ПРАДАЕЦЦА**

**Альтовы блёк хлет** (флейту) фірмы «Jupiter» або лепшы, прынамсі, ня горшы. Т.: 247-13-40. Запрасеце пана Скіргайлу

**Участак** зямлі прадам (в.Сасновая, барысаўскі напрамак), 0,15 га. Т.: (8-0296) 32-12-72

**Элітны беларускі** штодзёньнік з малюнкамі Н.Орды (15,5 тыс.). Т.: 260-94-76 (Алена)

**Прадаецца** «Літоўскі Статут» (выд.1988 г.). Т.: 227-19-89. Пэйдж.: 211-85-85, аб.20997. Анатоль Каляда

**Прадаю паштоўкі** зь відамі Віцебску (200 штук за 5000 руб.). Вул.Цітова 121-15, 210021, Віцебск

**ПРАЦА**

**Выдавецтва** зацікаўленае ў супрацоўніцтве з аўтарамі падручнікаў па польскай мове. Т.: 260-94-76 (хатні, запытайце Алену)

**Шукаю працу** выкладчыка фізыкі ў беларускамоўнай школе. Маю практыку выкладаньня на падвышаным узроўні.Т.: 263-70-69

**Надрукую** дыплёмную працу, рэфэрат. Augen1975@mail.ru

«Наша Ніва» дзякуе за падтрымку сп.Анатолю Васілеўскаму (Менск).

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ________________

Імя і прозьвішча ________________

Адрас, тэлефон ________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
выпускны рэдактар — Сяргей Ёрш
карэктар — Сяргей Петрыкевіч
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, (0296) 13-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3711.

Нумар падпісаны ў друк 23.04.2003.

Замова № 2196.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а